Дэпартамент па архівах і справаводству
Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі

# «ДЛЯ ЛЕПШОЕ ТВЕРДОСТИ...»

**Пергаментныя дакументы
перыяду Вялікага Княства Літоўскага з фондаў
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
(1391–1566 гг.)**

Мінск
«Беларусь»
2018

УДК 930.25(476):94(476)“1391/1566”(093.2)
ББК 63.3(4Беи)4
Д52

*Рэкамендавана да друку Вучоным саветам*
*Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі*

Укладальнікі:
*Я. С. Глінскі, А. А. Жлутка, Д. В. Лісейчыкаў*

Рэдкалегія:
*В. І. Кураш, Д. В. Лісейчыкаў, Д. Ч. Матвейчык, Д. У. Яцэвіч*

Рэцэнзенты:
загадчык аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі Інстытута гісторыі
Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук *А. Б. Доўнар*

загадчык аддзела археаграфіі Беларускага навукова-даследчага інстытута
дакументазнаўства і архіўнай справы, кандыдат гістарычных навук *В. С. Пазднякоў*

Праца выканана ў рамках планавай навуковай тэмы
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
*«Беларусь у актавых кнігах»*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

Д52 **«Для лепшое твердости…»: пергаментныя дакументы перыяду Вялікага Княства Літоўскага з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (1391–1566 гг.)** / уклад.: Я. С. Глінскі, А. А. Жлутка, Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск : Беларусь, 2018. – 143 с.; [3] іл.
ISBN 978-985-01-1261-3.

У кнізе апублікаваны 29 найбольш старажытных пергаментных дакументаў са збораў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, якія ахопліваюць часавы прамежак з 1391 па 1566 г. і адлюстроўваюць разнастастайныя бакі сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця Вялікага Княства Літоўскага. Дакументы ўтвараюць некалькі ўнутрана звязаных комплексаў, якія дазваляюць прасачыць абставіны існавання канкрэтных маёнткаў і жыццядзейнасці іх уладальнікаў на працягу некалькіх пакаленняў. Большасць дакументаў публікуецца ўпершыню.

Прызначаецца для даследчыкаў, выкладчыкаў, студэнтаў, усіх тых, хто цікавіцца гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага і пісьмовасці.

**УДК 930.25(476):94(476)“1391/1566”(093.2)**
**ББК 63.3(4Беи)4**

**ISBN 978-985-01-1261-3**

© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі», 2018
© Афармленне. Выдавецтва «Беларусь», 2018

# ЗМЕСТ

**Прадмова** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
**Спіс скарачэнняў і ўмоўных абазначэнняў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
**Дакументы** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22

**№ 1.** – *1391 г. чэрвеня 20.* Пацвярджальны прывілей гаспадара Падольскай зямлі Фёдара Карыятавіча прывілеяў Канстанціна і Фёдара Карыятавічаў слугу Грыньку на горад Сакалец (з межамі ўладанняў) з сёламі Глінянец, Варанавіца, Прылук, Іллінцы і дароўнага ліста цешчы Грынькі княгіні Андрыянавай Вейніцкай на сёлы Мікулінцы, Летыня, Ванячын, Дзяшкоўцы, Стражэўка «у деднину и в вотнину». . . . . . . . . . . . . . . . . . 22

**№ 2.** – *1433 г. [верасня 1 – снежня 31] ці 1434 г. [студзеня 1 – жніўня 31].* Фундушавы ліст князя Аляксандра (Алелькі) Уладзіміравіча Лаўрышаўскаму манастыру на данніка Пятра Саковіча і дзесяціну з двара Турэц Навагародскага павета Троцкага ваяводства. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25

**№ 3.** – *[1458 г.] снежня 13.* Прадажны ліст пана Ерша Цярэшкавіча пану Пятру Манцігердавічу і яго сыну Яну на маёнтак Доўгія Шыі Луцкага павета Валынскай зямлі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

**№ 4.** – *1488 г. верасня 5.* Фундушавы ліст Дашкі Яцкавіча Храптовіча Лаўрышаўскаму манастыру на даннікаў сяла Шчорсы Навагародскага павета Троцкага ваяводства Марочку Міхалкавіча, яго пляменніка Іванца, а таксама парабка Стафана. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29

**№ 5.** – *1492 г. мая 5.* Мяноўны ліст гаспадарскага маршалка, дворнага падскарбія, слонімскага намесніка Яна Багданавіча Літавора Храптовіча Лаўрышаўскаму манастыру на зямлю з адной цяглай службай у вёсцы Мілушава Навагародскага павета Троцкага ваяводства за адмову ад дзесяціны з двара Дзераўная Навагародскага павета Троцкага ваяводства. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31

**№ 6.** – *1502 г. [верасня 1 – снежня 31] ці 1503 г. [студзеня 1 – жніўня 31].* Фальсіфікат. Прывілей пінскага князя Фёдара Іванавіча Яраславіча і яго жонкі княгіні Алены «слузе дворанину» Савасцьяну Скеве-Апановічу і Грыцку Князіковічу на дварышчы Адаліцкае, Іванцоўскае, Мануйлаўскае, Укухаравецкае, Катлукоўскае з двума агароднікамі ў сяле Альпень Давыд-Гарадоцкага павета. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

**№ 7.** – *[Паміж 1503 г. студзеня 10 – 1506 г. жніўня 19].* Прадажны ліст баярына Адама Янушкавіча і яго жонкі Ганны магілёўскаму, анікштынскаму і біршданскаму намесніку князю Мацвею Мікіцінічу на двор Эйтвілішкі з зямлёй Явілтышкі Віленскага ваяводства і дварышча ў Віленскім замку. . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

**№ 8.** – *1511 г. красавіка 20.* Пацвярджальны прывілей пінскага князя Фёдара Іванавіча Яраславіча і яго жонкі княгіні Алены баярыну Фёдару Пятровічу Шчэпе на «данину» князя Івана Васільевіча Яраславіча – землі Паўлікоўшчына ў вёсцы Лукавец, Дашкоўшчына ў вёсцы Навадворац, Даўбечыча, Керстаноўшчына, Юнцаўшчына, П’янічына Ніва ў месце Клецку, Сазонаўшчына і Пісараўшчына ў сяле Якшычы (са спісам сялян); з дараваннем зямель Васілевай Кліменціча ў вёсцы Лукавец і Таўпечынай, сенажацей Бухлічаў у вёсцы Навадворац, пляца і двара Батурынскага ў паркане ў месце Клецку Клецкага княства. . . . . . . . . . . . . . . 39

**№ 9.** – *1513 г. студзеня 3.* Прывілей пінскага князя Фёдара Іванавіча Яраславіча і яго жонкі княгіні Алены баярыну Далмату Андрэевічу на людзей Якава Некрашэвіча, Івана, Васіля і Ігната Крупічаў у сяле Вялікія Арлы Давыд-Гарадоцкага павета з іх сем’ямі, ворнымі землямі і ўваходамі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42

**№ 10.** – *1515 г. студзеня 30.* Мяноўны ліст пінскага князя Фёдара Іванавіча Яраславіча баярыну Фёдару Пятровічу Шчэпе на поле Навадворскае і прылеглыя да яго сенажаці ў Клецкім княстве за поле і сенажаці ў вёсцы Лукавец Клецкага княства. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44

**№ 11.** – *1516 г. сакавіка 4.* Фундушавы ліст вялікага князя літоўскага Жыгімонта І парафіяльнаму касцёлу ў мястэчку Мерач Троцкага ваяводства на пустаўшчыны Арэшкішкі і Карпешкі і луг Мідбора каля ракі Мерач. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45

**№ 12.** – *1519 г. жніўня 15.* Прадажны ліст пана Багдана Андрэевіча «брату» пану Багдану Касцюшкавічу на трэцюю частку маёнтка ў сяле Мачуль Давыд-Гарадоцкага княства. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48

**№ 13.** – *[1521 г.] студзеня 14.* Дароўны ліст пана Юрыя Іванавіча Зяноўевіча слугу Ваську Кісарэю на дварэц Камарышкі Ашмянскага павета Віленскага ваяводства. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51

**№ 14.** – *1521 г. лістапада 15.* Фальсіфікат. Фундушавы ліст пана Аношкі Вітонізскага і яго сыноў Андрэя і Фёдара Лаўрышаўскаму манастыру на дзве валокі сенажацей у Шчорсаўскай пушчы за ракой Нёман і палову луга Дрэваскіпішча. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52

**№ 15.** – *1525 г. верасня 20.* Пацвярджэнне віленскага біскупа Яна з князёў Літоўскіх фундушавага ліста ад 11 верасня 1515 г. вялікага князя літоўскага Жыгімонта І парафіяльнаму касцёлу ў мястэчку Адэльск Троцкага ваяводства на вёску Трычоўшчына Троцкага ваяводства, шэсць чалавек у мястэчку Адэльск і інш. . . . . . . . 54

**№ 16.** – *1529 г. верасня 4.* Вырак суда вялікага князя літоўскага і паноў-рад дваранiну Васілю Нікіфаравічу Бранцу, яго цешчы Марыне Першкавай і жонцы Багдане па справе паміж імі і давыд-гарадоцкім зямянінам Багданам Касцюшкавічам аб валоданні землямі, людзьмі і мядовымі данінамі ў сёлах Рамель, Мачуль, Пераходзічы, Вольшы Давыд-Гарадоцкага павета і інш. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59

**№ 17.** – *1542 г. лютага 20.* Сумнеўны дакумент. Прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта I лідскаму баярыну Фёдару Мажэйку на дварэц Дзераўное. . . . . 62

**№ 18.** – *1544 г. мая 6.* Прадажны ліст двараніна Васіля Нікіфаравіча Бранца, яго цешчы Марыны Першкавай Шахаўны, яго жонкі Багданы Першкаўны і іх дзяцей пану Анофрыю Васільевічу Касцюшковічу на трэцюю частку зямель у сёлах Рамель, Мачуль, Пераходзічы, Вольшы Давыд-Гарадоцкага павета, землі ў месце Давыд-Гарадок за 100 коп літоўскіх грошай; з заставай іншых дзвюх частак за 170 коп літоўскіх грошай. . . . . 64

**№ 19.** – *1544 г. жніўня 9.* Фундушавы ліст Ганны Радагоскай, дачкі Пятра Крупскага, парафіяльнаму касцёлу ў вёсцы Шылавічы Ваўкавыскага павета Навагародскага ваяводства на трох агароднікаў, трох падданых і дзесяціну з маёнтка Шылавічы з пацвярджэннем дароўнага ліста Ганны і яе сясцёр Соф'і і Ітамілы Крупскіх ад 9 кастрычніка 1511 г. на дзве госпады. . . . . 68

**№ 20.** – *1549 г. чэрвеня 14.* Прадажны ліст стольніка Вялікага Княства Літоўскага, радунскага і дубіцкага дзяржаўцы Станіслава Кезгайлы пану Юрыю Вярбіцкаму на пустаўшчыну Шашкоўшчыну, дзве службы путных баяр Дабрынічаў, тры службы цяглых сялян з падараваннем сенажацей Ігуменскіх на рацэ Лубень у маёнтку Дзераўная Менскага павета Віленскага ваяводства за 200 коп літоўскіх грошай (са спісам путных баяр і цяглых сялян). . . . . 72

**№ 21.** – *1551 г. снежня 1.* Пацвярджальны прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста прадажнага ліста ад 4 лістапада 1547 г. стольніка ВКЛ Станіслава Кезгайлы пану Юрыю Вярбіцкаму на маёнтак Сухаверхаўшчына на Хатаве Менскага павета Віленскага ваяводства (са спісам путных баяр і межамі маёнтка) і прадажнага ліста ад 14 чэрвеня 1549 г. Станіслава Кезгайлы Юрыю Вярбіцкаму на пустаўшчыну Шашкоўшчыну, дзве службы путных баяр Дабрынічаў, тры службы цяглых сялян з падараваннем сенажацей Гуменскіх (Ігуменскіх) на рацэ Лубень у маёнтку Дзераўная Менскага павета Віленскага ваяводства (са спісам путных баяр і цяглых сялян). . . . . 75

**№ 22.** – *1554 г. чэрвеня 30.* Пацвярджальны прывілей вялікай княгіні літоўскай Боны пінскім слугам Васілю Юнкавічу і Федзьку Родцавічу на дварышча Ляхавіцкае ў сяле Плотніца Пінскай воласці «да ласкі». . . . . 79

**№ 23.** – *1555 г. сакавіка 15.* Прадажны ліст паноў Малхера і Станіслава Станіслававічаў Шэметаў, Яна і Малхера Андрэевічаў Завішаў віленскаму ваяводзе, канцлеру ВКЛ Мікалаю Янавічу Радзівілу на маёнтак Налібакі Менскага павета Віленскага ваяводства, маёнткі Солы і Свядасць Вількамірскага павета за 11335 коп літоўскіх грошай; з пацвярджэннем з боку Мікалая Янавіча Радзівіла правоў Шэметаў і Завішаў на маёнткі Дзявілтава, Мілашуны, дварэц Мантрымішкі Вількамірскага павета Віленскага ваяводства, маёнтак Дзераўная Менскага павета Віленскага ваяводства, маёнтак Швекшны Жамойцкай зямлі. . . . . 81

**№ 24.** – *1560 г. кастрычніка 23.* Мяноўны ліст пана Івана Юр'евіча Храптовіча віленскаму ваяводзе, канцлеру ВКЛ, земскаму маршалку князю Мікалаю Янавічу Радзівілу на сёлы Лытчычы і Гнесічы ў маёнтку Сенна Навагародскага павета Навагародскага ваяводства за сяло Купіцк у маёнтку Нягневічы Навагародскага павета Навагародскага ваяводства (з упісаннем мяноўных лістоў ад 4 і 5 лістапада 1559 г., спісам сялян і межамі ўладанняў). . . . . 85

**№ 25.** – *1561 г. сакавіка 31.* Пацвярджальны прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста дзельчага ліста ад 18 мая 1560 г. княгіні Кузьміной Іванавіча Заслаўскай – Настассі Юр'еўны Гальшанскай і князя Аляксандра Іванавіча Палубенскага і яго жонкі княгіні Зафеі Юр'еўны Гальшанскай на маёнтак Глуск Навагародскага павета Навагародскага ваяводства з замкам, местам і воласцю і палову двара Рычоў Мазырскага павета. . . . . 93

**№ 26.** – *1561 г. снежня 17.* Пацвярджальны прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста мяноўнага ліста ад 23 кастрычніка 1560 г. двараніна Івана Юр'евіча Храптовіча ваяводзе віленскаму, канцлеру ВКЛ, земскаму маршалку князю Мікалаю Радзівілу на сёлы Лытчыцы і Гнесічы ў маёнтку Сенна Навагародскага павета Навагародскага ваяводства за сяло Купіцк у маёнтку Нягневічы Навагародскага павета Навагародскага ваяводства (з упісаннем мяноўных лістоў ад 4 і 5 лістапада 1559 г., спісам сялян і межамі ўладанняў). . . . . 100

**№ 27.** – *1562 г. кастрычніка 17.* Пацвярджальны прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста вяноўнага ліста ад 16 кастрычніка 1562 г. князя Андрэя Іванавіча Вішнявецкага жонцы Яўфіміі Юр'еўне Вярбіцкай на 2000 коп літоўскіх грошай на трэцяй частцы яго ўладанняў. . . . . 108

**№ 28.** – *1562 г. кастрычніка 17.* Пацвярджальны прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста дароўнага ліста ад 16 кастрычніка 1562 г. княгіні Андрэевай Іванавіча Вішнявецкай – Яўфіміі Юр'еўны Вярбіцкай яе мужу князю Андрэю Іванавічу Вішнявецкаму на маёнтак Сухаверхаўшчына на Хатаве Менскага павета Віленскага ваяводства і сенажаці Ігуменскія на рацэ Лубень. . . . . 111

**№ 29.** – *1566 г. снежня 28.* Пацвярджальны прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста тастамента віленскага ваяводы, канцлера ВКЛ князя Мікалая Янавіча Радзівіла ад 27 мая 1565 г. . . . . 115

**Асабовы паказальнік** . . . . 120

**Геаграфічны паказальнік** . . . . 130

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры** . . . . 138

# ПРАДМОВА

*«Листъ нашъ на папере писаный имъ дали <...> Который то листъ они передъ нами покладали и били намъ чоломъ, абыхмо тотъ листь нашъ имъ отменили, а на паркгамене дати его казали»*[1].

З ліста вялікага князя літоўскага Жыгімонта I
віленскім мяшчанам.
8 кастрычніка 1540 г.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі з'яўляецца адным з найбуйнейшых архівасховішчаў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. На сённяшні дзень ён утрымлівае 1 022 165 адзінак захавання, згрупаваных у 3 157 фондах. Агульная даўжыня архіўных стэлажоў складае амаль 12 км.

Да найбольш каштоўных і запатрабаваных дакументаў без сумневаў можна аднесці актавыя кнігі з фондаў судовых устаноў Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага XV–XVIII стст., а таксама аб'ёмны фонд «Радзівілы, князі» – асноўную частку дакументаў архіва Нясвіжскай ардынацыі знакамітага рода, які воляй лёсу быў расцярушаны па сховішчах Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі і Украіны. Менавіта гэтыя фонды ў першую чаргу прыцягваюць увагу медыявістаў і даследчыкаў Ранняга Новага Часу.

Як паказаў вопыт планавай перапрацоўкі і ўдасканалення фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, надзвычай каштоўныя раннія дакументы таксама могуць утрымлівацца і ў фондах устаноў перыяду Расійскай імперыі. Арыгінальныя дакументы XIV–XVIII стст. з прыватных, царкоўных альбо манастырскіх архіваў часта траплялі ў судовыя органы розных інстанцый у якасці доказаў па маёмасных спрэчках альбо для пацвярджэння знатнага паходжання сваіх уладальнікаў. Сыходзячы з гэтага архівістамі НГА Беларусі было прынята рашэнне правесці мэтанакіраванае выяўленне падобных дакументаў у фондах устаноў XIX – пачатку XX ст. з наступным аднясеннем іх да катэгорыі ўнікальных. Такія дакументы ў першую чаргу падлеглі алічбоўцы і стварэнню падрабязнага ліста апісання і ўліку на кожны з іх. Усё разам гэта паспрыяла фарміраванню спіса найбольш каштоўных, інфарматыўных і прэзентабельных дакументаў, своеасаблівай «візітнай карткі» архіва, якія маюць не толькі навуковую і мастацкую вартасць, але і нясуць вялікі папулярызатарскі патэнцыял[2].

Супрацоўнікі аддзела старажытных актаў НГА Беларусі, якія праводзілі выяўленне і адбор, кіраваліся ў сваёй працы адразу некалькімі крытэрыямі. Гэта час стварэння дакумента, яго юрыдычнае значэнне, дачыненне да важных гістарычных падзей і асоб, палеаграфічныя і лінгвістычныя асаблівасці, мастацкая вартасць. Паводле стану на пачатак 2018 г. у зборах архіва выяўлена 67 дакументаў, рэкамендаваных да аднясення да катэгорыі ўнікальных. Сярод іх рознага кшталту прывілеі манархаў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, фундушы на заснаванне і ўтрыманне цэркваў, манастыроў і касцёлаў, а таксама невялікая падборка яўрэйскіх літургічных рукапісаў. Асноўную частку, 54 пазіцыі, у гэтым спісе складаюць дакументы, створаныя на пергаменце – найбольш старажытным і каштоўным матэрыяле для пісьма. Зразумела, у XV–XVI стст. важныя і каштоўныя дакументы ствараліся і на паперы. Складзены архівістамі НГА Беларусі пералік утрымлівае таксама шэраг папяровых дакументаў, такіх як вядомы дароўны ліст княгіні Марыі віцебскаму намесніку Івану Ільінічу, датуемы канцом 70-х – пачаткам 80-х гг. XV ст.[3], і многія іншыя. Аднак сам факт таго, што складальнікі спынялі свой выбар менавіта на пергаменце, сведчыў аб выключным

---

[1] Собрание древних грамот и актов городов: Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам. – Ч. 1. – Вильна: Типография А. Марциновского, 1843. – С. 69.

[2] Пачаткі дадзенай працы сягаюць яшчэ ў 70-я гг. XX ст. Менавіта тады ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве БССР на падставе матэрыялаў фонду «Радзівілы, князі» быў падрыхтаваны пералік пергаментных дакументаў XVI–XVII стст., які ўтрымліваў 19 пазіцый. Сярод іншага ён уключаў тыя дакументы, якія апублікаваны ў дадзеным выданні пад нумарамі 8–11, 13, 20, 21, 25, 27, 28. Меркавалася надрукаваць іх на старонках «Археографического ежегодника», які выдаваўся Акадэміяй навук СССР, або нават у выглядзе асобнага выдання. Аднак гэтыя праекты ажыццёўлены не былі (НАРБ. Ф. 249. Воп. 5. Спр. 1657. Арк. 127, 136–146). Выказваем падзяку загадчыку кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта кандыдату гістарычных навук М. Ф. Шумейку за зварот увагі на гэтыя падзеі.

[3] *Пазднякоў, В.С.* Беларуская грамата XV ст.: дароўны ліст княгіні Марыі намесніку віцебскаму Івану Ільінічу на сяльцо каля ракі Друць // Герольд Litherland. – № 19. – Горадня – Менск, 2013. – С. 118–125.

значэнні падзеі, якая фіксавалася на пісьме, як для адрасата, так і для адрасанта. Выкарыстоўваючы тагачасны канцылярызм, можна сказаць, што пергамент упоравень з пячаткай і ўласнаручным подпісам складальніка ў гэтым выпадку быў закліканы служыць «*для лепшое твердости*» дакумента.

Уяўленні аб «*твердости*» пергаментных дакументаў часта прыводзілі да цікавых анахранізмаў. Так, губернскія дваранскія дэпутацкія сходы Расійскай імперыі аж да 40-х гг. XIX ст. працягвалі выдаваць т. зв. «патэнты аб шляхецкай годнасці», складзеныя на пергаменце[4]. Гэта мусіла лішні раз пераканаць чытача ў старажытнасці і аўтэнтычнасці падаваемых звестак. Аргумент «пергамент – старажытны, папера – не» наўпрост выкарыстоўваўся ў маёмасных спрэчках XIX ст. Напрыклад, радзівілаўскія архівісты ў 20-х гг. XIX ст. высмейвалі сваіх апанентаў, якія ў якасці доказаў прадставілі некалькі папяровых дакументаў канца XIV ст. «*У той час на паперы нічога не пісалі, а ўсё – на пергаменце альбо скуры*» – сцвярджалі архіварыусы Радзівілаў і ў якасці прыклада прыводзілі арыгінальны прывілей 1391 г. са сваіх збораў, «*складзены на пергаменце, пісаны даўнім рускім спосабам*»[5].

Гісторыя пісьма на пергаменце пачалася ў 2-м тысячагоддзі да н. э. у Пярэдняй Азіі і Егіпце. Пергаменты выраблялі з адмыслова апрацаванай скуры жывёл. У Высокім і Познім Сярэднявеччы адрознівалі два іх тыпы: паўночны, або нямецкі («charta Theutonica») апрацоўваўся з абодвух бакоў і выраблялася з цялячых скур; паўднёвы, інакш італьянскі («charta Italica») рабілі са скур казлоў, баранаў і ягнят, яго ўнутраны («мясны») бок адбельвалі крэйдай, а знешні бок пакідалі неадбеленым, шэравата-жоўтага колеру. Паўднёвы пергамент вылучаўся белізной, быў больш тонкім і далікатным. Але ў Вялікім Княстве Літоўскім, як і ў большасці краін Еўропы, атрымаў распаўсюджанне паўночны тып. Пергамент быў дэфіцытным таварам, яго недахоп асабліва адчуваўся на землях ВКЛ у другой палове XIII – XIV стст.[6]

Улічваючы вялікую навуковую і мастацкую вартасць, а таксама знешнюю атракцыйнасць захоўваемых у НГА Беларусі пергаментных дакументаў, многія з якіх дагэтуль не ўведзены ў навуковы ўжытак, было вырашана падрыхтаваць да публікацыі самыя старажытныя з іх. У якасці верхняй храналагічнай мяжы быў абраны 1569 г., калі быў падпісаны акт Люблінскай уніі, які аб'яднаў Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства Польскае ў федэратыўную дзяржаву – Рэч Паспалітую. Ніжняй храналагічнай мяжой паслужыла дата самага ранняга захоўваемага ў НГА Беларусі пергаментнага дакумента – 1391 г.

Публікуемыя дакументы ахопліваюць далёка не ўсе рэгіёны Вялікага Княства Літоўскага. Пераважна гэта цэнтральныя і заходнія раёны нашай старажытнай дзяржавы (гл. карту 1). Найбольшая іх колькасць была створана, што натуральна, у сталіцы – Вільні. Даволі шмат дакументаў было напісана ў Навагародку і навакольных маёнтках, а таксама ў іншых буйных рэгіянальных цэнтрах – Берасці, Гародні, Клецку, Луцку і Пінску. Два дакументы былі створаны па-за межамі Вялікага Княства Літоўскага – у Варшаве і Смотрычы.

Такім чынам, у дадзеным выданні апублікаваны **29 пергаментных дакументаў** са збораў **Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі**, якія ахопліваюць часавы прамежак **з 1391 па 1566 г.** і адлюстроўваюць разнастастайныя бакі сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця Вялікага Княства Літоўскага. 26 з гэтых дакументаў складзены на «рускай» мове, якую ў сучасных навуковых даследаваннях прынята называць старабеларускай альбо стараўкраінскай, 3 – на лацінскай мове.

Асобныя дакументы, прадстаўленыя ў зборніку (6, 14 і 17), з'яўляюцца фальсіфікатамі альбо маюць прыкметы фальсіфікацыі. Аднак гэтая акалічнасць не ставіць пад сумнеў неабходнасць іх публікацыі. Папершае, яны былі сфальсіфікаваны ў XVII – пачатку XVIII ст., што дае выдатную магчымасць вывучыць узровень абазнанасці тагачаснага пісьменнага чалавека ў асаблівасцях складання і бытавання пергаментных дакументаў XV–XVI стст. Па-другое, толькі шляхам публікацыі падробленых дакументаў з прывядзеннем навукова абгрунтаваных доказаў падробкі можна пазбегнуць далейшага выкарыстання іх у навуковым ужытку ў якасці сапраўдных. Падрабязнасці ўсіх акалічнасцей фальсіфікацыі пазначаны ў каментарыях да дакументаў.

Варта адзначыць, што падрыхтоўка археаграфічных выданняў, якія асвятляюць пытанні гісторыі Вялікага Княства Літоўскага XIV–XVI стст., мае працяглую традыцыю. Распачатыя ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. выяўленне і публікацыя крыніц ахапілі большасць значных дакументальных комплексаў, якія быта-

---

[4] Толькі ў фондзе Мінскага губернскага дваранскага дэпутацкага сходу захавалася некалькі соцень такіх дакументаў. Асобныя справы цалкам складзены з дзясяткаў пергаментных патэнтаў (напрыклад, НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 4049).

[5] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 178. – Арк. 6 адв. (Згаданы прывілей 1391 г. апублікаваны ў дадзеным зборніку. Гл. дакумент 1).

[6] Пра гісторыю пергамента як матэрыялу для пісьма падрабязней гл. *Груша, А. І.* Беларуская кірылічная палеаграфія: вучэб. дапам. для студэнтаў гістарычных факультэтаў. – Мінск: БДУ, 2006. – С. 59–63; *Жлутка, А. А.* Лацінская актавая палеаграфія. – Мінск: БелНДІДАС, 2015. – С. 29–32.

валі на тэрыторыі ВКЛ. Пераважная частка гэтых выданняў кіравалася тэматычным прынцыпам[7]. Складальнікі адбіралі дакументы да публікацыі сыходзячы з уласных густаў альбо ідэалагічных перакананняў. Значна радзей публікаваліся цэлыя дакументальныя комплексы[8]. Між тым, у цяперашні час цікавасць да публікацыі асобных комплексаў дакументаў ці іх частак узрастае[9].

Істотная частка публікуемых дакументаў прама альбо ўскосна адносіцца да фамільнага архіва князёў Радзівілаў, аднаго з самых уплывовых арыстакратычных родаў Вялікага Княства Літоўскага. Засяроджанне ў руках роду шэрагу пасад, якія фактычна ператвараліся ў спадчынныя, а таксама велізарныя зямельныя ўладанні, прывяло да канцэнтрацыі ў архіве Радзівілаў каласальных дакументальных комплексаў. Так, напрыклад, часткай архіва сталі статыстычныя матэрыялы і перапіска, звязаныя з вядзеннем вайны з Маскоўскай дзяржавай 1534–1537 гг. (т. зв. «Старадубская вайна»), калі войскам ВКЛ кіраваў найвышэйшы гетман Юрый Мікалаевіч Радзівіл[10]. У архіве Радзівілаў захоўвалася дакументальная («дыпламатычная») частка гаспадарскага скарбу[11]. Як уладальнікі вялікай колькасці маёнткаў у самых розных рэгіёнах ВКЛ і Каралеўства Польскага[12], Радзівілы назапасілі ў сябе мноства матэрыялаў прыватна-прававога характару, звязанага са здзелкамі на зямлю. Дзякуючы існаванню ў ВКЛ практыкі перадаваць разам з зямлёй і звязаную з ёй дакументацыю[13], у архіве Радзівілаў адкладаліся акты, юрыдычнымі аўтарамі якіх былі прадстаўнікі іншых родаў. Да падобных дакументаў, напрыклад, можна аднесці дакументы 3, 7, 13, апублікаваныя ў дадзеным зборніку.

Падзелы Рэчы Паспалітай прывялі да аслаблення пазіцый роду Радзівілаў. Гэта адбілася і на стане архіва роду. У выніку з канца XVIII ст. ад яго адасобілася частка, якая складалася з арыгіналаў актаў былога гаспадарскага скарбу. Яна адразу трапіла ў радзівілаўскую рэзідэнцыю ў Нябораве, на пачатку XX ст. ненадоўга вярнулася ў Нясвіж, а пасля набыцця Польшчай у 1918 г. незалежнасці была перамешчана ў Варшаву. У 1946 г. гэтая частка была штучна адасоблена і ператворана ў фонд-калекцыю «Zbiór dokumentów pergaminowych» («Збор пергаментных дакументаў») Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве[14]. Другая частка архіва Радзівілаў патрапіла ў рукі прыватных калекцыянераў, а пасля markрознымі шляхамі апынулася ў сховішчах Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі, Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве, Бібліятэцы

[7] Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией / И. И. Григорович (гл. ред.) [и др.]. – Санкт-Петербург: Типография Эдуарда Праца; Типография II отделения Собственной Е. И. В. канцелярии, 1846–1853. – 5 т.; Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией / Н. И. Костомаров, Г. Ф. Карпов. – Санкт-Петербург: Типография Эдуарда Праца; Типография А. Катанского и К°, 1861–1892. – 15 т.; Архив Юго-Западной России, издаваемый комиссией для разбора древних актов, состоящей при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе / Киевская Археографическая комиссия. – Киев: Типография Г.Т. Корчак-Новицкого, 1859–1911. – 8 ч.

[8] Акты, издаваемые Виленской археографическою комиссиею: в 39 т. / Ю. Ф. Крачковский (гл. ред.) [и др.]. – Вильна: Типография А.Г. Сыркина; Типография «Русский Почин», 1865–1915. – Т. 17: Акты Гродненского земского суда / К. Снитко. – 1890. – LXXIII, 559 с.; Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею: в 39 т. / Ю. Ф. Крачковский (гл. ред.) [и др.]. – Вильна: Типография А.Г. Сыркина; Типография «Русский Почин», 1865–1915. – Т. 22: Акты Слонимского земского суда / К. Снитко. – 1895. – LXIV, 471 с.; Русская историческая библиотека, издаваемая Императорскою Археографическою комиссиею: в 39 т. / Императорская Археографическая комиссия; Постоянная Историко-Археографическая Комиссия АН СССР. – СПб; Петроград; Ленинград: Сенатская типография; Издание АН СССР, 1872–1927. – Т. 20: Литовская Метрика. Т. 1. Кн. 1: Судных дел (1510–1517). Кн. 2: Судных дел (1506–1523) / П.А. Гильтебрандт [и др.]. – 1903. – 1566 стб.

[9] Акти Волинського воєводства кінця XV–XVI ст. (із зібрання Пергаментних документів Архіву головного актів давніх у Варшаві) / Підг. до друку А. Блануци, Д. Ващука, Д. Вирського; відп. ред. Г. Боряк. – Київ: Ін-т історії України НАН України, 2014. – 154 с.; Віцебска-Рыжскія акты XIII—XVII ст.: дагаворы і службовая карэспандэнцыя паміж органамі кіравання горада Віцебска і ганзейскага горада Рыгі (з былога комплекса Ruthenica Дзяржаўнага Гістарычнага Архіва Латвіі). – Выпуск I: Дакументы гаспадарча-гандлёвыя, XV–XVI ст. / Падр. А. Дзярновіч. – Мінск: ATHENAEUM, 2005. – 88 с.; *Ліцкевіч, А.У.* Старабеларускія граматы XV ст. з Archiwum głównego akt dawnych у Варшаве // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі: зб. навук. арт. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; рэдкал.: Л.Г. Кірухіна [і інш.]. – Мінск, 2009. – Вып. 12. – С. 6–41; Памятники истории Восточной Европы: источники XV–XVII вв. = Monumenta Historica Res Gestas Europae Orientalis illustrantia: fontes XV–XVII saec. / Редкол.: И. Граля [и др.]. – Москва; Варшава: Древлехранилище, 2002. – Т. 6: Радзивилловские акты из собрания Российской национальной библиотеки (первая половина XVI в.) / Сост. М. М. Кром. – 2002. – 267 с.

[10] Памятники истории Восточной Европы… – Т. 6. – С. 9.

[11] *Латушкин, А. Н.* Восстановление целостности комплекса оригиналов государственно-правовых актов 1387–1601 гг. архива Великого княжества Литовского: постановка проблемы // Пути становления и развития государственности в Восточной Европе в период Средневековья и раннего Нового времени: сб. ст. междунар. науч. круглого стола «Пичетовские чтения», Минск, 9 нояб. 2016 г. / Бел. гос. ун-т, редкол.: О.А. Яновский [и др.]. – Минск, 2017. – С. 82.

[12] *Malczewska, M.* Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. – Warszawa; Poznań: Państwowe Wyd-wo Naukowe, 1985. – 169 s.

[13] *Груша, А. И.* Документальная письменность Великого Княжества Литовского (конец XIV – первая треть XVI в.). – Минск: Беларуская навука, 2015. – С. 337.

[14] *Латушкин, А. Н.* Восстановление целостности… – С. 82.

ім. Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук і Нацыянальнай бібліятэцы Літвы[15]. Рэшта архіва, якую складалі пераважна дакументы аб землеўладанні, з 1929 г. заставалася ў Нясвіжы. Менавіта гэтыя дакументы складаюць аснову сучаснага фонда 694 «Радзівілы, князі» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі[16].

Асобныя, часта самыя каштоўныя, акты з архіва Радзівілаў у XIX ст. трапілі ў фонды судовых устаноў. Зразумела, у якасці доказаў у судах яны маглі выкарыстоўвацца і раней. Аднак справаводства органаў улады ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай патрабавала толькі актыкацыі дакумента (узнаўлення яго тэксту ў актавай кнізе). Справаводства ж судовых органаў Расійскай імперыі патрабавала пакідаць арыгіналы ў складзе справы, заведзенай у ходзе працэсу. У выніку гэтага, напрыклад, частка пергаментаў з архіва Радзівілаў патрапіла ў фонд Мінскай аб’яднанай палаты крымінальнага і цывільнага судоў (дакументы 1, 3, 24, 26, 29). У гэты ж фонд у якасці доказаў супрацьлеглага Радзівілам боку патрапілі арыгіналы дакументаў з архіва Лаўрышаўскага манастыра.

Паколькі некаторыя з публікуемых актаў выкарыстоўваліся ў судовых працэсах XVII–XIX стст., то ў фондах адпаведных судовых устаноў Вялікага Княства Літоўскага і Расійскай імперыі ствараліся і адкладаліся спісы гэтых дакументаў. Як правіла, яны ствараліся на польскай ці рускай (расійскай) мове для большай зручнасці ў карыстанні тагачаснымі чыноўнікамі. Чытанні па іх у дадзеным выданні не падаюцца, паколькі яны не маюць канкрэтна-гістарычнага значэння.

Стан захаванасці публікуемых дакументаў залежаў ад умоў захавання ў складзе судовых спраў, а таксама ад якасці рэстаўрацыйных работ, большасць якіх была праведзена ў другой палове XX ст. Пергаментная аснова дакументаў захавана адносна добра. Матэрыял для пісьма ў большасці дакументаў не мае істотных пашкоджанняў. Некаторыя з грамат маюць забруджванні пергаментнай асновы (напрыклад, дакументы 1, 8, 26), што, зрэшты, рэдка замінае прачытанню тэксту. Чарнілу большасці дакументаў таксама ўласціва добрая захаванасць – эфекту кіслага чарніла або згасання ў асноўным не назіраецца. Аднак амаль усе дакументы на пэўным этапе захоўвання страцілі пячаткі (большасць была змацавана прывесістымі пячаткамі) і нават шнуры ад іх. Некаторыя дакументы прайшлі праз рэстаўрацыю, якая абмяжоўвалася галоўным чынам нарошчваннем асновы (напрыклад, дакумент 20).

Сярод публікуемых пергаментаў галоўную частку складаюць дакументы, складзеныя на старабеларускай альбо стараўкраінскай мовах, і таму іх лёгка дыферэнцыяваць з пункту гледжання графікі пісьма. Усім ім у цэлым уласціва тэндэнцыя паступовай змены, якая ўкладаецца ў наступную схему: паўустаў – паўустаў, якi пераходзіць у скорапіс – скорапіс. Скорапіс у прадстаўленых дакументах пачынае пераважаць з другога дзесяцігоддзя XVI ст. і падзяляецца на тыповыя ўзоры рэгулярызаваных скорапісаў адпаведных перыядаў. Пісьмо большасці актаў выразнае, яго націск сярэдні. Адлегласць паміж радкамі, шырыня і вышыня корпусу літар з’яўляюцца тыповымі для тых перыядаў, калі складаліся дакументы. Графічныя варыянты і асаблівасці напісання асобных літар у вялікай колькасці не сустракаюцца. Памеры літар, цітлы і знакі скарачэння таксама тыповыя для часу стварэння кожнага з дакументаў. Зразумела, усё гэта не тычыцца фальсіфікатаў, аб кожным з якіх маецца падрабязны каментарый. Некаторыя рукапісы маюць асаблівыя формы вязі, выкарыстаныя ў ініцыялах. Найчасцей яны сустракаюцца ў дакументах, што выйшлі з-пад рук пісараў буйных родаў або дзякоў вялікакняжацкай канцылярыі, што таксама ў цэлым заканамерна для дакументаў гэтага часу.

Пісьмо лацінскіх дакументаў (11, 15 і 19) гуманістычнае, з дыферэнцыяцыяй паводле ступені ўфармаванасці і ўрачыстасці. Скарачэнні ў дакументах нешматлікія, тыповыя для эпохі і такіх тыпаў пісьма. Пісьмо дакумента 11 сярэдняй вагі, слабакантраснае, сярэдняй вышыні. Дакумента 15 – сярэдняй вагі, кантраснае пераважна ў падрадковых і надрадковых росчырках, нізкае, шырокае. Паводле фармальных адзнак пісьмо дакументаў 11 і 15 можна акрэсліць як гуманістычнае паўкурсіўнае натарыяльнае. Пісьмо дакумента 19 сярэдняй вагі, некантраснае, высокае, вузкае. Яго можна акрэсліць як гуманістычнае дыпламатычнае.

Прыцягненне дакументаў у якасці судовых доказаў і іх знаходжанне ў складзе фамільных архіваў прывяло да таго, што падчас карыстання пергаментамі на іх пакідалі паметкі. Паметкі на дакументах умоўна можна падзяліць на наступныя групы:

• паметкі радзівілаўскіх архіварыусаў (дакументы 1, 3, 5–11, 13, 15, 18–21, 23–29);

• паметкі, прастаўленыя на дакументах падчас іх актыкацыі ў судовых органах ВКЛ (дакументы 2, 4, 6, 12, 14–18, 22);

• паметкі, прастаўленыя ў ходзе перадачы дакументаў у судовыя ўстановы Расійскай імперыі (дакументы 14, 17, 20, 21, 23–29);

---

[15] Памятники истории Восточной Европы… – Т. 6. – С. 6–7.

[16] *Галенчанка, Г. Я.* Архівы Радзівілаў // Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя – Т. 1. – Мінск: БелЭН, 2007. – С. 243.

• іншыя (паметкі, прастаўленыя ў час выдання дакумента або незадоўга пасля яго – дакументы 11, 14, 25, 29; паметкі архівістаў XX ст. – дакументы 11, 15, 19, 28; паметкі з паходжаннем, якое цяжка паддаецца ідэнтыфікацыі – дакументы 5, 10, 16, 22, 26).

Большая частка дакументаў ахоплена пагінацыяй. Яна ўяўляе сабой нумары пазнейшага паходжання, прастаўленыя архівістамі пры падшыванні дакументаў у справы. Пагінацыя выканана графітавым алоўкам.

Такім чынам, абраныя для публікацыі акты аб'яднаны адной знешняй прыкметай – матэрыялам, на якім былі створаны (пергамент). Аднак яны не з'яўляюцца разрозненнымі і не звязанымі паміж сабой, а ўтвараюць некалькі цэласных комплексаў. Большасць гэтых комплексаў у сваім канчатковым выглядзе склалася ў XIX ст. і ў той ці іншай ступені звязана з архівам князёў Радзівілаў у Нясвіжы. Аднак пачаткі іх фарміравання ўзыходзяць да больш ранняга перыяду – пераважна да XVII ст., а часам і да XVI ст. Сама гісторыя функцыянавання канкрэтных дакументаў, іх захавання і выкарыстання дазваляе раскрыць акалічнасці жыцця і дзейнасці іх уладальнікаў.

## «Лаўрышаўскі» комплекс
(дакументы 2, 4, 5, 14, 23, 24, 26, 29 і ўмоўна дакументы 1, 3)

Першы комплекс дакументаў, умоўна назавём яго «лаўрышаўскім», звязаны з маёмаснымі спрэчкамі, якія на працягу XVII – першай паловы XIX ст. вяліся на мяжы Новагародскага і Менскага паветаў Рэчы Паспалітай (пазней – Навагрудскага павета Гродзенскай губерні і Ашмянскага павета Віленскай губерні Расійскай імперыі) паміж Лаўрышаўскім манастыром, уладальнікамі маёнткаў Налібакі і Нягневічы[17] князямі Радзівіламі і ўладальнікамі маёнткаў Сенна і Шчорсы Храптовічамі[18]. Асноўным ініцыятарам судовых працэсаў з'яўляўся Лаўрышаўскі манастыр, які меў шматлікія фундушы і запісы (пераважна XV – першай паловы XVI ст.)[19] на невялікія надзелы, якія межавалі з маёнткамі Нягневічы і Сенна. Паміж Лаўрышаўскім манастыром і яго суседзямі пастаянна адбываліся памежныя спрэчкі. Асабліва яны абвастрыліся ў першай трэці XVII ст. У 10–30-я гг. XVII ст. прадстаўнікі манастыра неаднойчы падавалі скаргі на дзеянні адміністрацыі радзівілаўскага маёнтка Нягневічы, часам трымальнікі і аканомы маёнтка Нягневічы таксама скардзіліся на манахаў і іх падданых[20]. У выніку ў 1628 г. у Новагародскім земскім судзе манастыр пачаў працэс супраць Альбрыхта Станіслава Радзівіла і застаўных трымальнікаў Нягневічаў[21].

Напружаныя адносіны з суседзямі прымусілі лаўрышаўскіх манахаў у 1644 г. падаць наяўныя ў іх маёмасныя дакументы на актыкацыю ў Галоўны Трыбунал ВКЛ. Адпаведныя нататкі аб упісанні ў актавыя кнігі маюцца на дакументах 4, 5, 14. Яшчэ раней, у 1630 г., у Новагародскі земскі суд быў пададзены самы стары лаўрышаўскі дакумент – ліст ад 1433/1434 г. князя Алелькі Уладзіміравіча на дзесяціну з двара Турэц (дакумент 2). Але не ўсе гэтыя запісы аб актыкацыі сапраўдныя. Так, пазнака аб актыкацыі ў 1644 г. на дакуменце 14 (фундушавым лісце Аношкі Вітонізскага ад 15 лістапада 1521 г. на дзве валокі сенажацей і палову луга Дрэваскіпішча) зроблена зусім іншым чарнілам, чым адпаведныя пазнакі на дакументах 4 і 5. Верагодна, яна была дапісана ў больш позні час для пераканання ў «сапраўднасці» ліста. Пры гэтым сфальсіфікаваным быў не толькі запіс аб актыкацыі, але і сам ліст Аношкі. У судовых справах, якія вяліся Лаўрышаўскім манастыром у XVII ст., ён ніякім чынам не згадваўся. Яго «з'яўленне» належыць аднесці да перыяду наступнага абвастрэння ў адносінах паміж манастыром і ўладальнікамі размешчаных побач зямель, якое прыпала на першыя два дзесяцігоддзі XVII ст. Пачатак яму паклалі працэсы, якія ў 1702–1706 гг. вёў супраць князёў Радзівілаў (у асобе Караля Станіслава і яго жонкі Ганны Кацярыны) настаяцель Лаўрышаўскага манастыра

---

[17] У 1809 г. маёнтак Нягневічы Навагрудскага павета Гродзенскай губерні ў кн. Дамініка Радзівіла набыў гр. Адам Храптовіч (НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 7. – Спр. 778. – Арк. 80–83).

[18] Апрача Радзівілаў і Храптовічаў, у гэтым крайне цераспалосным зямельным комплексе больш дробнымі маёнткамі валодалі і іншыя землеўласнікі. Так, на 20–30-я гг. XIX ст. імі з'яўляліся Булгакі, Абуховічы, Гацiскія, Каралевічы, Пясецкія, Лазарэвічы (НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 24).

[19] Частка з іх была ўкладзена ў Лаўрышаўскае Евангелле. Гэтыя ўкладныя запісы публікаваліся (найбольш поўна – *Friedelówna, T.* Ewangeliarz Ławryszewski. Monografia zabytku. – Wrocław et al.: Zakład Narodowy imienia Ossolińskich, Wyd-wo PAN, 1974. – S. 66–73). Таксама вядомы рэестры дакументаў Лаўрышаўскага манастыра, у якіх пазначаны і незахаваныя наданні (Прывілеі польска-літоўскіх манархаў з Евангелляў Лаўрышаўскага манастыра (XIV–XVI ст.) / Падрыхт. Ю. М. Мікульскі // Беларуская даўніна. – Вып. 1. – Мінск, 2014. – С. 124–131; Сведения об утраченных грамотах XIV–XV вв. из Лавришевского Евангелия / Подгот. Ю. Н. Микульский // Беларуская даўніна. – Вып. 2. – Мінск: Выдавец А. М. Вараксін, 2015. – С. 152–156).

[20] Манастыр тады ж вёў працэсы аб забранні зямель і супраць іншых суседзяў – уладальнікаў маёнтка Сенна Храптовічаў (НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 723–726).

[21] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 341–343 адв., 359–359 адв., 364–367 адв., 371–376.

Іосіф Сапаровіч[22]. Як і амаль за стагоддзе да гэтага, падставай для канфлікту стала цераспалоснасць лаўрышаўскіх і нягневіцкіх валоданняў[23]. Але менавіта ў гэты час І. Сапаровіч акрэсліваў межы лаўрышаўскіх валоданняў тымі ж мікратапонімамі, якія паказаны ў дакуменце 14. Пры гэтым, як вынікае з пратэстацыі, унесенай у Навагародскі гродскі суд у 1705 г., пры апеляцыі да гэтых межаў манахі першапачаткова спасылаліся не на фундуш Аношкі, а выключна на інвентар, створаны 6 ліпеня 1601 г. пры паданні манастыра Іосіфу Вельяміну-Руцкаму[24]. Больш за тое, межы з фундуша Аношкі амаль даслоўна супадаюць з адлюстраванымі ў інвентары – «*по Глꙋбокꙋю долинꙋ, по Рꙋсецькыи могылныкъ, ꙋ сꙋхомертвыи Каледин дꙋбъ, по Гнесецкꙋю верею, ꙋ Лозовыи Рꙋсеч, посерод Лозового полѧ, в Самоилович ѡстров*»[25].

Хутчэй за ўсё, дакумент 14 быў сфальсіфікаваны якраз у пачатку XVIII ст. – паміж 1705 г. (калі ён яшчэ не згадваецца ў пратэстацыі І. Сапаровіча) і 1711 г. (калі ён быў актыкаваны ў Галоўным Трыбунале ВКЛ). Апрача неаўтэнтычнай пазнакі аб актыкацыі і падазроных супадзенняў пры акрэсліванні межаў валоданняў, фундуш Аношкі змяшчае шэраг іншых недакладнасцей і сумнеўных месцаў[26]. Аднак гэты ліст быў не адзіным фальсіфікатам, створаным у Лаўрышаўскім манастыры ў пачатку XVIII ст. Разам з ім у актавыя кнігі Галоўнага Трыбунала ВКЛ у 1711 г. былі ўнесены яшчэ два фальсіфікаты – абмежаванне Пятра Манцігердавіча ад 1398 г. зямель Лаўрышаўскага манастыра[27] і падаўчы ліст ад 18 чэрвеня 1601 г. гаспадарскага двараніна Фёдара Жданавіча Беліковіча кіеўскаму мітрапаліту Іпацію Пацею на Лаўрышаўскі манастыр[28]. На іх таксама маюцца фіктыўныя пазнакі аб актыкацыі ў 1644 г., выкананыя тым жа почыркам і чарнілам, як на дакуменце 14. Таксама, як і ў выпадку ліста Аношкі, гэтыя дакументы служылі падмацаваннем у спрэчках з уладальнікамі і аканомамі маёнтка Нягневічы. У 1705 г. І. Сапаровіч сцвярджаў, што нягневіцкая адміністрацыя прысвоіла сабе манастырскія хмелішчы[29] і акурат на прыналежнасці хмелішчаў зроблены асаблівы акцэнт у абмежаванні Пятра Манцігердавіча[30]. Падаўчы ліст Іпацію Пацею таксама змяшчаў апісанне межаў манастырскага маёнтка. Цікава, што ў ім наданне Аношкі Вітонізскага не згадвалася, межы вызначаліся на падставе паказанняў «*людеи добрых и сведков*»[31]. Гэта можа сведчыць пра храналагічны парадак стварэння фальсіфікатаў – спачатку падаўчы ліст ад 1601 г., затым ліст Аношкі Вітонізскага[32].

[22] **Іосіф Сапаровіч** (нарадзіўся каля 1665 г. у Валынскім ваяводстве) – манах-базыльянін. Скончыў клас «рыторыкі». Навіцыят праходзіў у базыльянскіх манастырах у в. Дзермань на Валыні і ў м. Быцень Слонімскага павета. Да 1703 г. – новагародскі афіцыял і генеральны пракуратар Кіеўскай мітраполіі. У 1703–1709, 1711–1713 гг. настаяцель Лаўрышаўскага манастыра (Институт российской истории Российской Академии наук. – Ф. 52 (коллекция П.Н. Доброхотова). – Оп. 1. – Д. 328. – Л. 163; Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси (далей – АСД). – Т. 13. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1902. – С. 13–14). У 1709–1710 гг. – архімандрыт базыльянскага манастыра ў г. Трокі (АСД. – Т. 2. – Вильна: Печатня Губернского правления, 1867. – С. 168; АСД. – Т. 5. – Вильна: Печатня А. Г. Сыркина, 1871. – С. 51–54; АСД. – Т. 12. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1900. – С. 158). У 1699 г. склаў першы рэестр архіва ўніяцкіх мітрапалітаў Кіеўскіх, Галіцкіх і Усёй Русі, які захоўваўся ў маёнт. Рута Навагародскага ваяводства (*Mironowicz, A.* Źródła petersburskie do dziejów Kościoła Wschodniego w Rzeczypospolitej // Stan badań nad wielokulturowym dziedzictwem dawnej Rzeczypospolitej / Red. W. Walczak i K. Łopatecki. – T. II. – Białystok, 2010. – S. 193).

[23] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 408–423, 443–444, 460–461. Гэты працэс паміж манастыром і князямі Радзівіламі вядомы ў навуковай літаратуры, гл. *Гудмантас, К., Рычкоў, А.* «Натыфікацыя пра Лаўрышаўскі манастыр, выпісаная са старой рускай летапіснай хронікі Дзяметрыя Занкевіча». Даследаванне і публікацыя крыніцы // Arche. – 2016. – № 2: Гісторыя старажытнага Навагрудка. – С. 335–338.

[24] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 414–414 адв.

[25] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 1729 адв.

[26] Пра іх падрабязней гл. заўвагі да дакумента 14.

[27] LVIA. – F. 8. – Ap. 1. – B. 60. – L. 1329–1331 v.; Абмежаванне публікавалася як сапраўднае, гл. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. – Т. 11: Акты Главного Литовского Трибунала. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1880. – С. 3–4.

[28] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 246–249 адв.; LVIA. – F. 8. – Ap. 1. – B. 60. – L. 1323–1326 v.

[29] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 419.

[30] *«А шъто монастырскаꙗ хмелища здавна, въ тое кнꙗзꙗ великого людемъ не надобе ꙋстꙋпатисе»* (LVIA. – F. 8. – Ap. 1. – B. 60. – L. 1330; Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. – Т. 11… – С. 4). Пра абмежаванне Пятра Манцігердавіча ў кантэксце судовых працэсаў Лаўрышаўскага манастыра пачатку XVIII ст. згадваецца ў артыкуле літоўскіх даследчыкаў Кястуціса Гудмантаса і Андрэя Рычкова (*Гудмантас, К., Рычкоў, А.* «Натыфікацыя пра Лаўрышаўскі манастыр, выпісаная са старой рускай летапіснай хронікі Дзяметрыя Занкевіча»… – С. 337–338), але там гэты фальсіфікат разглядаецца як верагодна сапраўдны дакумент.

[31] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 246 адв.

[32] Самым першым па часе стварэння з гэтых падробак было абмежаванне Пятра Манцігердавіча – манахі спасылаліся на яго падчас працэсу супраць Радзівілаў ужо ў 1705 г. (НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 420 адв.). Магчыма, дакумент існаваў ужо ў 1702 г., калі ў «Рэестры крыўд…» Лаўрышаўскага манастыра адзначалася, што іх маёнтак «быў вялікім князем Вітаўтам пацверджаны і размежаваны» (НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 393; *Гудмантас, К., Рычкоў, А.* «Натыфікацыя пра Лаўрышаўскі манастыр, выпісаная са старой рускай летапіснай хронікі Дзяметрыя Занкевіча»… – С. 337).

Асновай для стварэння дакумента 14 стаў менавіта інвентар Лаўрышава ад 1601 г.[33], дакладней, тая яго частка, дзе пазначаны межы паміж валоданнямі манастыра і радзівілаўскімі часткамі вёсак Лычыцы і Гнесічы. Паказальным з'яўляецца тое, што ў інвентары 1601 г. у больш позні час было дапісана, што манастыр мае *«сеножати две волоки в пѣщи Щерсовскои за Немном»*[34], а менавіта яны, сярод іншага, фігуравалі ў лісце Аношкі Вітонізскага.

Спрэчкі не спыняліся і нанова актывізаваліся ў 20-я гг. XIX ст. У выніку апошняга судовага працэсу дакументы Лаўрышаўскага манастыра трапілі ў Мінскую аб'яднаную палату крымінальнага і цывільнага судоў і адкладаліся ў яе фондзе.

Увогуле дакументы 2, 4, 5 і 14 даюць уяўленне пра землеваладанне Лаўрышаўскага манастыра. Самі манахі ў XVIII ст. апісвалі свае даўнія валоданні як «некалькі дзясяткаў валок», пры гэтым адзначалі, што большасць надзелаў (апрача наданняў Хадкевічаў і Храптовічаў) была забрана іх суседзямі[35]. Гэтыя звесткі прымаюцца ў навуковай літаратуры як верагодныя[36]. Але, як можна меркаваць, у рэчаіснасці нават у XV–XVI стст. маёнтак манастыра быў куды больш сціплым, пры чым правы валодання на некаторыя землі не былі падмацаваны дакументальна, што вымушала манахаў займацца фальсіфікацыяй. Росквіт фальсіфікацый культавымі ўстановамі і асобнымі святарамі архіўных дакументаў прыпадае на XVIII ст.[37] Падробка здзяйснялася паводле прынцыпа «дакумент у дакуменце» – як правіла, фальсіфікаты бытавалі ў выглядзе выпісаў з актавых кніг судовых устаноў, якія даслоўна цытавалі «арыгіналы» дакументаў XV–XVI стст., і нават XIV ст.[38] Фальсіфікацыя шляхам падробкі аўтэнтычных пергаментных дакументаў з імітацыяй почырка і лексікі, як гэта практыкавалася стагоддзем раней, у XVIII ст. сустракаецца рэдка.

Дакументы Лаўрышаўскага манастыра не толькі дазваляюць прасачыць фарміраванне і развіццё манастырскага землеўладання, але і дапаўняюць веды пра шляхецкія валоданні ў раёне Лаўрышава, Нягневічаў і Сенна. Так, у дакуменце 5 згадваюцца размешчаныя паблізу ад манастыра землі старых навагародскіх родаў Гаўсовічаў і Хмарычаў. Абодва гэтыя роды (асабліва Хмарычы) на працягу XVI–XVIII стст. істотна здрабнелі і ў XIX ст. у час т. зв. «разбору шляхты» не валодалі ніякімі дакументамі раней за XVII ст.[39] Па ўсёй верагоднасці аслабленне іх маёмаснага становішча было выклікана ў тым ліку наступствамі суседства з маёнткамі буйных паноў – Радзівілаў і Храптовічаў, якія з мэтай павелічэння сваіх валоданняў маглі скупаць размешчаныя побач землі[40]. У гэтым іх лёс быў падобны да акалічнасцей існавання Лаўрышаўскага манастыра, які таксама страчваў свае землі на карысць Радзівілаў і Храптовічаў.

Са свайго боку праціўнікі Лаўрышаўскага манастыра, перш за ўсё, тагачасны ўладальнік Шчорсаў і Нягневічаў граф Адам Храптовіч у працэсе, які распачаўся ў 1827 г., для абгрунтавання сваёй пазіцыі па пытанні межаў маёнткаў таксама выстаўлялі дакументы XVI–XVII стст. Да іх у першую чаргу належаць акты абмену землямі, які ў 1559–1560 гг. ажыццявілі канцлер ВКЛ віленскі ваявода Мікалай Янавіч Радзівіл «Чорны» і гаспадарскі дваранін Іван Юр'евіч Храптовіч[41]. Мікалай Радзівіл атрымаў вёскі Гнесічы

---

[33] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 1727–1735 адв.

[34] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 1732.

[35] АСД. – Т. 13. – С. 18.

[36] *Марозава, С.* Лаўрышаўскі манастыр // Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя. – Т. 2 / 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 2007. – С. 187; *Кулагін, А. М.* Праваслаўныя храмы Беларусі: Энцыкл. давед. – Мінск: БелЭн, 2007. – С. 221; *Котельников, А.* Вклады в Лавришевский монастырь от основания (ок. 1250 г.) до принятия унии в 1596 г. // Богослов.ru. Научный богословский портал [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.bogoslov.ru/text/2973415.html. – Дата доступу: 11.01.2018.

[37] *Gil, A.* Dokument z 1521 roku dla cerkwi w Opolu koło Włodawy (w części brzeskiej diecezji włodzimierskiej). Przyczynek do działalności edytorskiej Wileńskiej Komisji Archeograficznej // W kręgu dziejów i kultury Kościołów wschodnich w Rzeczypospolitej. – Siedlce, 2009. – S. 51–58; *Лісейчыкаў, Д. В.* «Ponieże Swiaty Sobor Zamoyski krypko poweliwait...»: сфальсіфікаваная візіта царквы ў в. Дзмітравічы Аршанскага павета Вялікага Княства Літоўскага 1621 г. // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 14 / рэд.: Ю.М.Бохан [і інш.]. – Мінск: НГАБ, 2016. – С. 158–174.

[38] Гл., напрыклад, апублікаваны віленскімі археографамі пачатку XX ст. у якасці сапраўднага тастамент святара царквы Св. Крыжа ў Ваўкавыску Сямёна Прохаравіча Чапляеўскага ад 9 сакавіка 1443 г.: Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. – Т. 23: Акты Холмского гродского суда. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1896. – С. 1–2.

[39] НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 3407. – Арк. 24–27; Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 4: Г / Д. Ч. Матвейчык [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2016. – С. 301–304.

[40] Паказальна, што ў першай трэці XVII ст. Гаўсовічы абмянялі спадчынны маёнтак Тударава (ці яго частку) на ленны маёнтак Труханавічы Навагародскага ваяводства крайчага ВКЛ Аляксандра Людвіка Радзівіла (Гербоўнік беларускай шляхты. – Т. 4. – С. 301). Хмарычы (Хмары) у XVIII–XIX стст. таксама фіксуюцца як трымальнікі на радзівілаўскіх землях (НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 3407. – Арк. 24–27).

[41] Гэта дакументы 24 і 26. Дакумент 24 – непасрэдна абмен з боку Івана Храптовіча, дакумент 26 – пацвярджэнне апошняга вялікім князем літоўскім Жыгімонтам II Аўгустам. Адпаведныя дакументы са свайго боку выстаўляў і кн. Мікалай Радзівіл Чорны. Гл. Lietuvos Metrika (1559–1563). 40-oji Teismų bylų knyga (XVII a. pradžios kopija) / Parengė N. Šlimienė, I. Valikonytė. – Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla, 2015. – P. 113–119.

і Лычыцы, а ўзамен аддаў Івану Храптовічу вёску Купіцк. Абмен землямі ўключаў у сябе падрабязнае размежаванне[42], якое адлюстроўвае мікратапаніміку дадзенага рэгіёна ў сярэдзіне XVI ст. Пры гэтым мікратапонімы, якія адлюстраваны ў дакументах 24 і 26 (а таксама ў сфальсіфікаваным дакуменце 14)[43], захаваліся (з невялікімі змяненнямі) на дадзенай тэрыторыі да XIX ст. Напрыклад, Русіцкі луг стаў называцца луг Русеч, Лазовае поле – проста Лазамі, востраў Самойлавічы стаў вострававам Самуйлавым[44].

Судовы працэс 20–30-х гг. XIX ст. дапоўніў «лаўрышаўскі» комплекс дакументаў актамі, якія непасрэдна не былі з імі звязаны. Гэта тычыцца адных з самых старажытных дакументаў, змешчаных у дадзеным выданні, – дакументаў 1 і 3. Яны захоўваліся ў радзівілаўскім архіве ў Нясвіжы і былі прыцягнуты падчас судовага разбіральніцтва для выстаўлення дадатковых доказаў на карысць пазіцыі Антонія і Стэфаніі Радзівілаў. Так, напрыклад, дакумент 3 (прадажны ліст пана Ерша пану Пятру Манцігердавічу на маёнтак Доўгія Шыі) выкарыстоўваўся як доказ таго, што Пётр Манцігердавіч, які фігураваў у пададзеных Лаўрышаўскім манастыром дакументах як навагародскі намеснік, гэтую пасаду не займаў. Таксама дакумент 3 (разам з дакументам 1) прыкладаўся як сведчанне на карысць таго, што ў канцы XIV – XV ст. прывілеі ствараліся выключна на пергаменце[45]. Як бачым, падчас судовага разбіральніцтва першай трэці XIX ст. прыцягваліся і такія «навукападобныя» доказы[46]. Зрэшты, прадстаўнікі Радзівілаў у рэчаіснасці памыляліся – Пётр Манцігердавіч сапраўды пэўны час быў намеснікам у Навагародку (1430–1432, 1445–1456)[47].

Шлях дакумента 3 у радзівілаўскі архіў у Нясвіжы таксама быў няпростым. У гістарыяграфіі ўжо адзначалася[48], што ў нясвіжскім архіве дадзены дакумент зберагаўся разам з іншым актам на Доўгія Шыі – прывілеем князя Свідрыгайлы ад 1452 г. Ершу Цярэшкавічу. Можна меркаваць, што да нясвіжскай галіны Радзівілаў гэтыя дакументы трапілі як частка спадчыны пасля згасання роду Манцігердавічаў. Пасля гібелі ў 1500 г. апошняга мужчынскага прадстаўніка роду Яна Пятровіча Манцігердавіча іх валоданні перайшлі да Станіслава Пятровіча Кішкі, дачка якога Ганна выйшла замуж за Яна Мікалаевіча Радзівіла і перадала таму ў якасці пасагу частку былых манцігердаўскіх маёнткаў.

Створаны ў 1565 г. тастамент аднаго з самых вядомых прадстаўнікоў роду Радзівілаў – віленскага ваяводы і канцлера ВКЛ Мікалая Радзівіла «Чорнага» (дакумент 29) не змяшчаў ніякіх канкрэтных звестак аб родавых маёнтках. Тым не менш, ён таксама быў прыцягнуты падчас судовага працэсу ў першай трэці XIX ст. Радзівілаўскі бок з яго дапамогай імкнуўся даказаць, што нясвіжскі намеснік Мацей Кавячынскі не мог у 1566 г. правесці па распараджэнні Мікалая Радзівіла размежаванне з валоданнямі Лаўрышаўскага манастыра (дакумент аб гэтым быў адным з аргументаў лаўрышаўскіх манахаў), бо князь Мікалай памёр яшчэ ў маі 1565 г. і не мог аддаць адпаведнага загаду[49].

Пергаментныя дакументы «лаўрышаўскага» комплексу вылучаюцца і сваёй «архіўнай» гісторыяй. Калі манастырскія паперы актыўна выкарыстоўваліся іх уладальнікам і неаднойчы ўносіліся ў актавыя кнігі (пра што маюцца пазнакі на саміх дакументах), то дакументы, якія прадстаўлялі Радзівілы і Храптовічы, не маюць пазнак аб выкарыстанні іх у больш ранніх працэсах. На іх змешчаны толькі архіўныя шыфры і паметы аб унясенні ў рэестры. Верагодна, калі б не справа супраць Лаўрышаўскага манастыра 20–30-х гг. XIX ст., яны б так і засталіся ў фамільных зборах.

У гэтым судовым працэсе былі закрануты і межы суседняга радзівілаўскага маёнтка – Налібак (на той час у Ашмянскім павеце Віленскай губерні). Так у дадзены комплекс трапіў дакумент 23. Ён з'яўляецца часткай вялікай сукупнасці разнастайных актаў, якія адлюстроўваюць лёс спадчыны магнацкага роду Кезгайлаў. Па мужчынскай лініі іх род згас у 1554 г., калі адзін за адным памерлі стольнік ВКЛ Станіслаў Мікалаевіч Кезгайла і яго малагадовы сын Ян. Яшчэ да гэтага згасла старэйшая лінія роду Кезгайлаў, прадстаўнікі якой амаль спадчынна займалі высокі ўрад жамойцкага старосты. У 1532 г. спачыў троцкі кашталян, жамойцкі

---

42 Як вынікае з пачатковай часткі дакумента, цераспалосны характар валоданняў паміж Сеннам і Нягневічамі прыводзіў да канфліктаў не толькі з Лаўрышаўскім манастыром, але паміж Радзівіламі і Храптовічамі.

43 Нягледзячы на сваю верагодную сфальсіфікаванасць, дакумент 14 (ліст Аношкі Вітонізскага) адлюстроўвае лакальную тапаніміку, уласцівую часу яго верагоднага стварэння – пачатку XVIII ст.

44 НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 76 адв., 78 адв.

45 НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 174. – Арк. 546; Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 81 адв.; Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 178. – Арк. 6 адв.

46 Гэта не адзінкавы прыклад у «лаўрышаўскім працэсе», калі праціўнікі манастыра апелявалі да навуковых аргументаў. Напрыклад, яны адзначалі (верагодна, слушна), што абмежаванне Пятра Манцігердавіча ад 1398 г. і падаўчы ліст Іпацію Пацею ад 1601 г. напісаны адным і тым жа почыркам (НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 178. – Арк. 82).

47 *Пятраўскас, Р.* Літоўская знаць у канцы XIV – XV ст.: Склад – структура – улада / Пераклад з літоўскай мовы А. Мікус. – Смаленск: Інбелкульт, 2014. – С. 267–268.

48 Новые документы к истории Юго-Западной Руси XV в. / Подгот. Ю. Н. Микульский // Беларуская даўніна. – Вып. 2. – Мінск: Выдавец А. М. Вараксін, 2015. – С. 137.

49 НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 174. – Арк. 539; НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 2. – Спр. 175. – Арк. 97–97 адв.

староста Станіслаў Станіслававіч Кезгайла, у пачатку 40-х гг. XVI ст. памерлі яго дзеці Войцех і Ганна[50]. Іх спадчына, якая атрымала назву «ракуцёўскай»[51], пераважна трапіла ў рукі вышэйзгаданага Станіслава, а пасля яго смерці павінна была перайсці яго пляменнікам Малхеру і Станіславу Станіслававічам Шэметам, Яну і Малхеру Андрэевічам Завішам. Аднак Завішы і Шэметы мусілі неўзабаве пазбыцца часткі кезгайлаўскай спадчыны. Так, у 1555 г. яны прадалі дзядзьку Станіслава Мікалаевіча Кезгайлы канцлеру ВКЛ віленскаму ваяводзе Мікалаю Радзівілу «Чорнаму» маёнткі Налібакі Менскага павета, Солы і Свядасць Вількамірскага павета. Гэта быў зразумелы крок – Мікалай Радзівіл усё адно быў фактычным уладальнікам, бо трымаў іх у заставе. Такім шляхам Налібакі апынуліся ў руках роду Радзівілаў[52]. Што тычыцца іншых пазначаных у дакуменце 23 валоданняў (Дзявілтава, Мілашуны, Мантрымішкі Вількамірскага павета, Дзераўная Менскага павета, Швекшны Жамойцкай зямлі і іншыя), то паводле праведзенага ў тым жа 1555 г. падзелу ўсе яны дасталіся Завішам[53].

## «Хатаўскі» комплекс
(дакументы 20, 21, 27, 28)

Наступны комплекс змешчаных у дадзеным выданні актаў тычыцца маёнтка Хатава Менскага павета, а таксама закранае гісторыю суседняга маёнтка Дзераўная. Як і паказаныя ў дакуменце 23 валоданні, Хатава да сярэдзіны XVI ст. належала Кезгайлам, аднак абставіны яе выхаду з-пад іх улады былі больш складанымі. Як вынікае з дакументаў 20 і 21, у 1547–1549 гг. Станіслаў Мікалаевіч Кезгайла прадаў маёнтак Хатава (ён жа Сухаверхаўшчына) Юрыю Венцлававічу Вярбіцкаму. Сама па сабе дадзеная здзелка была даволі будзённай – Хатава была невялікім маёнткам і пастаянна здавалася Кезгайламі ў заставу[54]. Тым не менш, цікавасць выклікае постаць яе набыўцы. Юрый Вярбіцкі (†паміж 1566 і 20.02.1571) уяўляў сабой прыклад чалавека, які здолеў зрабіць бліскучую кар’еру пры магнацкіх дварах і забяспечыць матэрыяльную магутнасць свайго роду. Паляк па паходжанні, ён, перш за ўсё, праявіў сябе пры двары князёў Юрыя I Сямёнавіча і Юрыя II Юр’евіча Алелькавічаў-Слуцкіх. Там ён адзначыўся як адміністратар і юрыст – займаў пасады петрыкаўскага (1537–1541) і слуцкага (1547) намесніка, неаднойчы прадстаўляў князёў у судовых працэсах[55]. Таксама Юрый Вярбіцкі выступаў у судах ад імя Кезгайлаў[56]. Апошняе, магчыма, пасадзейнічала набыццю ім маёнтка Хатава. Зрэшты, не апошнюю ролю ў гэтым маглі адыграць і роднасныя сувязі. Братам Юрыя з’яўляўся жамойцкі біскуп Венцлаў[57], які трымаў у заставе ад Станіслава Мікалаевіча Кезгайлы суседні маёнтак Дзераўная[58].

Аднак Хатава не стала цэнтрам родавых уладанняў Вярбіцкіх, бо Юрый не меў сыноў[59]. Адзінай спадчынніцай Юрыя і яго жонкі Ганны Урбанаўны[60] стала дачка Яўфімія. Яна ў чарговы раз звязала род Вярбіцкіх з кезгайлаўскай спадчынай, бо яе першым мужам з’яўляўся Ян Андрэевіч Завіша, які, аднак, памёр у 1557 г. Другім разам Яўфімія выйшла замуж за князя Андрэя Іванавіча Вішнявецкага, будучага валынскага ваяводу, якому адразу пасля шлюбу ў 1562 г. адпісала ўсю маёмасць. Так, у распараджэнні Вішнявецкага часова апынулася істотная частка кезгайлаўскай спадчыны, а разам з ёй і Хатава (Сухаверхаўшчына). Аку-

---

[50] *Pietkiewicz, K.* Kieżgajłowie i ich latyfundium do połowy XVI wieku. – Poznań: Wyd-wo Naukowe UAM, 1982. – S. 44–45, 88.

[51] Ад мянушкі Станіслава Станіслававіча Кезгайлы – Рэкуць.

[52] *Pietkiewicz, K.* Kieżgajłowie… – S. 126.

[53] НГАБ. – КМФ 18 (Метрыка ВКЛ). – Воп. 1. – Спр. 38 (Кніга запісаў 38). – Арк. 32–40.

[54] Да Юрыя Вярбіцкага Хатаву трымалі два пакаленні службоўцаў князёў Слуцкіх-Алелькавічаў – Пётр Ходкавіч і яго сын Аляксандр Тонаўскія.

[55] *Скеп’ян, Н.* Двор і слугі князёў Слуцкіх у канцы XV – 80-х гг. XVI стст. // Arche. – 2014. – № 6. – С. 316, 321, 324, 330, 339.

[56] *Pietkiewicz, K.* Kieżgajłowie… – S. 124–125

[57] Пра яго падрабязней гл. *Błaszczyk, G.* Diecezja żmudzka od XV do początku XVII wieku. Ustrój. – Poznań: UAM, 1993. – S. 55–57.

[58] Правы на Дзераўную ў 1556 г. таксама перайшлі да Юрыя Вярбіцкага (НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 953. – Арк. 2–2 адв., 4 адв., 5–6 адв.; Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 954. – Арк. 41–41 адв.).

[59] Ілона Чаманьска называе біскупа луцкага Віктарына Вярбіцкага братам дачкі Юрыя Яўфіміі (*Czamańska, I.* Wiśniowieccy. Monografia rodu. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2007. – S. 90). Аднак Віктарын быў ёй не родным, а стрыечным братам (КМФ 18 (Метрыка ВКЛ). – Воп. 1. – Спр. 38 (Кніга запісаў 38). – Арк. 377).

[60] Нават сучасным даследаванням (*Czamańska, I.* Wiśniowieccy… – S. 89) невядома імя жонкі Юрыя Вярбіцкага і адпаведна маці Яўфіміі. Як вынікае з дакументаў, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску, ёй была Ганна Урбанаўна герба «Лебедзь» (у 1562 г. яна прыклала да дароўнага ліста дачцэ Яўфіміі пячатку з такім гербам, гл. НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 954. – Арк. 57–57 адв.). Прозвішча жонкі Юрыя невядома. Цікава, аднак, што «Лебедзь» з’яўляўся гербам адных са спадкаемцаў Кезгайлаў – Шэметаў, але сярод апошніх для першай паловы XVI ст. ніводнага Урбана невядома (*Niesiecki, K.* Herbarz polski / Wyd. J. N. Bobrowicza. – T. 8. – Lipsk: Breitkopf i Haertel, 1841. – S. 618–620; *Boniecki, A.* Poczet rodów w Wielkiem Księstwie Litewskiem w XV–XVI w. – Warszawa: J. Berger, 1883. – S. 344–345).

рат частка шлюбна-маёмасных дамоў паміж Андрэем Вішнявецкім і Яўфіміяй Вярбіцкай адлюстравана ў дакументах 27 і 28.

Андрэй Вішнявецкі захаваў у сябе не ўсе атрыманыя ад жонкі маёнткі – у 1579 г. ён передаў пасынкам Андрэю, Яну і Юрыю Янавічам Завішам спадчыну іх бацькі – двор Швекшны Жамойцкай зямлі, замак і двор Ракаў, палову Бакштаўскай воласці Менскага павета, двары Дзявілтава і Мілашуны Вількамірскага павета, маёнтак Белагруда Лідскага павета, палову сёл даннікаў у Аршанскім павеце. Пры гэтым пасынкі 5 кастрычніка 1579 г. прадалі Андрэю Вішнявецкаму двор Дзераўная з дваром Дзеражное Менскага павета і маёнткі Вялікія і Малыя Васкевічы Лідскага павета[61]. Такім чынам Хатава, як частка маёнтка Дзераўная, стала паўнапраўнай уласнасцю князёў Вішнявецкіх. Пасля смерці князя Андрэя і Яўфіміі іх дочкі разам з мужамі 5 студзеня 1593 г. падзялілі маёмасць, у выніку чаго Дзераўная і Хатава трапілі ў рукі князёўны Альжбеты Яўфіміі (Гальшкі) Андрэеўны Вішнявецкай і яе мужа князя Мікалая Крыштафа Радзівіла[62]. Так Дзераўная і Хатава перайшлі да нясвіжскай галіны Радзівілаў.

Комплекс дакументаў на маёнткі Дзераўная і Хатава ў радзівілаўскім архіве пачаў афармляцца пасля смерці віленскага ваяводы Мікалая Крыштафа Радзівіла (†28.02.1616). Пра гэта сведчаць згадкі на дакументах 20, 21, 27 і 28 аб упісанні іх у рэестр у 1616 г. Такія ж запісы маюцца на іншых дакументах, якія звязаны з Дзераўной і Хатавой і захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Нягледзячы на тое, што ўвесь дзераўнянскі-хатаўскі комплекс дакументаў не выбыў з нясвіжскага архіва Радзівілаў і знаходзіўся там да яго ліквідацыі, гэтыя акты таксама выкарыстоўваліся падчас судовых працэсаў у першай палове XIX ст. У 1837 г. да іх апелявала Радзівілаўская маса падчас справы супраць былога суддзі Мінскага Галоўнага суда Вінцэнта Сушыцкага і яго жонкі Аляксандры, народжанай дэ Раэс, аб умовах валодання набытым імі фальварка Хатава Мінскага павета Мінскай губерні[63].

Сукупнасць «хатаўскіх» актаў дазваляе прасачыць не толькі пераход гэтага маёнтка ад Кезгайлаў да Вярбіцкіх, пасля да Вішнявецкіх і, нарэшце, да Радзівілаў. Яны таксама змяшчаюць каштоўную інфармацыю аб межах маёнтка Хатава і яго жыхарах. Асаблівую цікавасць уяўляюць занатаваныя ў іх звесткі пра кезгайлаўскіх службоўцаў – Булата (Багдана Булатава) і Сухаверха, ад імені якога маёнтак Хатава на пэўны час атрымаў новую назву, а таксама пра путных баяр, якія пражывалі ў Дзераўной і Хатаве. Паводле інвентароў канца XVI – XVIII ст. у маёнтку Дзераўная фіксуюцца баярскія (зямянскія) вёскі, перш за ўсё, Гуменаўшчына, насельніцтва якіх несла ваенную службу ў харугвах князёў Радзівілаў[64]. На жаль, толькі ў асобных выпадках ёсць магчымасць звязаць занатаваных у дакуменце 21 путных баяр з будучымі дзераўнянскімі зямянамі.

## «Дробнашляхецкі» комплекс
(дакументы 6, 8, 9, 10, 12, 16, 18, 22)

З зямянамі, а таксама з блізкай да іх паводле сацыяльна-эканамічнага становішча дробнай павятовай шляхтай звязаны наступны комплекс дакументаў, якія тэрытарыяльна адносяцца да Пінскага, Давыд-Гарадоцкага і Клецкага княстваў. Гэтыя землі ў пачатку XVI ст. належалі князям Яраславічам, а пасля згасання іх роду былі перададзены вялікім князем літоўскім Жыгімонтам I сваёй жонцы Боне Сфорцы, якая распараджалася імі да 1556 г. У 1558 г. Давыд-Гарадоцкае княства было падаравана вялікім князем літоўскім Жыгімонтам II князям Радзівілам. У іх падначаленні апынулася і мясцовае ваенна-служылае насельніцтва. На той момант яно складалася з трох частак – зямян-шляхты, панцырных і путных слуг, якія адрозніваліся памерамі абавязкаў і павіннасцей[65]. На працягу другой паловы XVI – XVII ст. гэтыя катэгорыі аб'ядналіся ў адну зямянскую супольнасць. Яе прадстаўнікі вылучаліся хіба заможнасцю, якая выяўлялася, перш за ўсё, у наяўнасці ці адсутнасці ўласных сялян.

Пры гэтым паміж зямянамі і ўладальнікамі Давыд-Гарадоцкага княства існаваў трывалы канфлікт, які асабліва абвастрыўся напрыканцы XVII ст. Супярэчнасці паміж імі вынікалі з імкнення зямян выйсці з-пад юрысдыкцыі радзівілаўскай адміністрацыі і ўвайсці ў склад паўнапраўнай пінскай павятовай шляхты. Ужо ў 1567 г., неўзабаве пасля перадачы Давыд-Гарадоцкага княства ва ўласнасць Радзівілам, Патрыкей, Анофрый і Іван Касцюшковічы спрабавалі ў гаспадарскім судзе выйсці з-пад давыд-гарадоцкай юрысдыкцыі, але,

[61] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 953. – Арк. 61 адв.–63 адв., 66 адв.–70.

[62] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. – Т. 1. – С. 246–248; *Wolff, J.* Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. – Warszawa: Drukiem J. Filipowicza, 1895. – S. 568.

[63] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 250. – Арк. 8 адв. –10 адв.

[64] НГАБ. – КМФ 5. – Воп. 1. – Спр. 737. – Арк 22. адв.; КМФ 5. – Воп. 1. – Спр. 738. – Арк. 22; КМФ 5. – Воп. 1. – Спр. 743. – Арк. 40–43.

[65] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 1133. – Арк. 8–8 адв.

як можна меркаваць, безвынікова. Паводле інвентароў другой паловы XVI – сярэдзіны XVII ст. давыд-гарадоцкія зямяне-шляхта, у тым ліку жыхары сёл Рамель і Мачуль, дзе некалі гаспадарылі Касцюшковічы, выстаўлялі коней у давыд-гарадоцкую харугву і ўносілі падымнае на карысць Давыд-Гарадоцкага замка[66]. Сітуацыя змянілася ў другой палове XVII ст. Першымі на падставе прывілеяў князёў Яраславічаў і вялікай княгіні Боны Сфорцы паспрабавалі даказаць сваё поўнае права на зямлю Алешы з сяла Беразцы – яшчэ ў 1661 г.[67] У канцы XVII ст. актывізавалася таксама і іншая давыд-гарадоцкая шляхта. Напрыклад, у 1690 г. з надзелаў у сёлах Рамель, Мачуль, Старое Сяло і Пераходзічы ўнеслі падымнае ў пінскі павятовы (а не давыд-гарадоцкі замкавы) збор Міхал Кульвінскі разам з маці і братам, Ян і Міхал Рамульты[68]. Верагодна, з-за гэтага непадпарадкавання канцлер ВКЛ клецкі ардынат Дамінік Мікалай Радзівіл накіраваў у 1694 г. камісараў Базыля Яна Вольскага і Тамаша Мікалая Вайніловіча для праверкі дакументаў давыд-гарадоцкай шляхты на ўласнасць. Акурат на дакументах 12, 16 і 18 маюцца запісы гэтых радзівілаўскіх рэвізораў. Шляхта, аднак, бачыла гэтую справу з іншага пункту погляду. Паводле яе Дамінік Мікалай Радзівіл накіраваў камісараў, «*ведаючы добра пра тое, што дакументы на гэтыя маёнткі маскоўцы і казакі забралі і спалілі, жадаючы пры дапамозе сваёй панскай моцы бедную шляхту прыціснуць і пад сваю ўладу, пад юрысдыкцыю давыд-гарадоцкага суда прывесці*»[69]. Апагей канфлікта прыйшоўся на 10-я – пачатак 30-х гг. XVIII ст., калі давыд-гарадоцкая шляхта вяла працэс супраць наступных клецкіх ардынатаў крайчых ВКЛ Яна Мікалая і Марціна Мікалая Радзівілаў у Галоўным Трыбунале ВКЛ. Справа завяршылася ў 1732 г. на карысць Радзівілаў. Давыд-гарадоцкая шляхта засталася служыць пад Давыд-Гарадоцкай харугвай, плаціць падаткі і актыкоўваць эканамічныя акты ў Давыд-Гарадоцкім замку[70]. Пры гэтым падчас спрэчкі 9 сакавіка 1718 г. радзівілаўскія райтарская і татарская харугвы на чале з рэчыцкім падчашычам Геранімам Вольскім і райтарскім вахмістрам Крыштафам Прыбароўскім здзейснілі напад на зямянскую ваколіцу Рамель, у выніку якога быў жорстка збіты былы давыд-гарадоцкі гродскі пісар Тамаш Рамульт, які, верагодна, успрымаўся як завадатар супраціўлення. Сведкі нападу адзначалі, што «*ні ад маскоўцаў, ні ад шведаў [...] не памятаюць ні ад якога непрыяцеля такога зруйнавання*»[71]. Давыд-гарадоцкая шляхта змагла выйсці з-пад радзівілаўскай юрысдыкцыі толькі ў 1791 г.[72]

Як адзначалася вышэй, асноўнымі арганізатарамі супраціўлення, прынамсі, у зямянскіх сёлах (ваколіцах) Рамель і Мачуль у канцы XVII – XVIII ст. з'яўляліся прадстаўнікі родаў Рамультаў і Кульвінскіх. Верагодна, менавіта ім належалі дакументы 12, 16, 18, якія ў 1694 г. дэманстраваліся радзівілаўскім рэвізорам. Аднак у гэтых дакументах не згадваюцца ні Рамульты, ні Кульвінскія, ні іншыя жыхары Рамля і Мачуля, якія падавалі гэтыя акты ў 1694 г. – Гяркевічы, Дастаеўскія, Дубянецкія, Дутыя, Курачыцкія. Дадзеныя акты тычацца роду Касцюшковічаў, прадстаўнікі якога ў другой палове XVII ст. ужо не пражывалі ў Давыд-Гарадоцкім княстве. Рамульты, Кульвінскія і іншыя рамельска-мачульскія зямяне атрымалі былыя касцюшковіцкія землі пераважна таму, што іх продкі былі жанаты з прадстаўніцамі роду Касцюшковічаў і прыдбалі часткі надзелаў у якасці пасагаў, маюцца звесткі і пра куплю імі зямель у Касцюшковічаў[73]. У большасці самі падаўцы дакументаў 12, 16, 18 у часы князёў Яраславічаў і вялікай княгіні Боны Сфорцы на тэрыторыі Давыд-Гарадоцкага княства не пражывалі і аселі на яго землях ужо ў часы гаспадарання Радзівілаў. Тыя ж Рамульты прыбылі ў Давыд-Гарадок з Польшчы недзе ў 70-я гг. XVI ст.[74] Кульвінскія фіксуюцца ў Рамлі і Мачулі з першай трэці XVII ст. (яны, як і Гяркевічы, напэўна, прыбылі з Троцкага ваяводства)[75]. Даста-

---

[66] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 3. – Спр. 12010. – Арк. 234–235 адв.; Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 1133. – Арк. 7–10 адв.; КМФ 5. – Воп. 1. – Спр. 673. – Арк. 37

[67] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 910. – Арк. 31 адв.

[68] НГАБ. – Ф. 1733. – Воп. 1. – Спр. 10. – Арк. 251 адв., 258 адв.

[69] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 780. – Арк. 86 адв.–87.

[70] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 3. – Спр. 12010. – Арк. 247–253; Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 780. – Арк. 84–122; Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 1577. – Арк. 5–50.

[71] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 780. – Арк. 90–94 адв.

[72] НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 32. – Арк. 98–103 адв.

[73] НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 10. – Арк. 593 адв.; Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 2694. – Арк. 12–13 адв.; НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 910. – Арк. 12–14 адв.

[74] *Рыбчонак, С.* Бальдвін-Рамульты гербу «Рамульт» // Малы гербоўнік Наваградзкай шляхты. – Мінск: БелНДІДАС, 1997. – С. 96.

[75] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 910. – Арк. 14; КМФ 5.– Воп. 1. – Спр. 673.– Арк. 37; *Boniecki, A., Reiski, A.* Herbarz polski. – T. 13. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1909. – S. 161–162; *Uruski, S.* Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. – T. 4. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1907. – S. 152; T. 8. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1911. – S. 194. У выпадку Кульвінскіх цікавым з'яўляецца тое, што, магчыма, іх прыбыццё ў Давыд-Гарадоцкае княства звязана са службай князям Радзівілам. Прынамсі, яшчэ ў 60-я гг. XVI ст. Мікалаю Радзівілу «Чорнаму» служыў Мікалай Кульвенскі (*Брэгер, Г.* Кліентэла віленскага ваяводы, канцлера ВКЛ Мікалая Радзівіла Чорнага паводле кніг Віленскага ўрада 1551–1565 гг. Спісы кліентаў. Выбраныя біяграмы // Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565 гг.): палітык, дыпламат, мецэнат: зборнік навук. прац. – Нясвіж: НГКМЗ «Нясвіж», 2016. – С. 37).

еўскія і Дубянецкія паходзілі з пінскай ваколічнай шляхты. Курачыцкія, верагодна, з дробнай шляхты Навагародскага ваяводства[76]. Таму для падмацавання сваіх правоў на зямлю яны маглі выкарыстаць толькі акты Касцюшковічаў, якія адносіліся да часу, калі Радзівілы яшчэ не трымалі Давыд-Гарадок.

Дакументы Касцюшковічаў цікавыя не толькі з нагоды іх далейшага выкарыстання давыд-гарадоцкай шляхтай у мэтах выхаду з-пад радзівілаўскай юрысдыкцыі. Самі па сабе яны ўяўляюць важную крыніцу для вывучэння шляхоў фарміравання давыд-гарадоцкага ваенна-служылага саслоўя ў XV – першай палове XVI ст. Як вынікае з іх, Касцюшковічы з'яўляліся часткай больш шырокага роду нашчадкаў баярына Грыца, які жыў недзе ў сярэдзіне XV ст.[77], і паходзілі з Валыні. Магчыма, іх продак атрымаў наданні ў Давыд-Гарадоцкім княстве, калі яго трымала ўдава валынскага князя Свідрыгайлы Ганна (1452–1471 гг.). Выклікае цікавасць і постаць гаспадарскага двараніна Васіля Нікіфаравіча Бранца, які ў 1529 г. судзіўся з Багданам Касцюшкавічам за валоданні ў Давыд-Гарадоцкім княстве (дакумент 16), а затым у 1544 г. прадаў свае землі пляменніку Багдана Анофрыю Васільевічу (дакумент 18). Як можна меркаваць на падставе яго мянушкі-прозвішча, ён сам альбо яго бацька з'яўляўся выхадцам з бранскіх зямель, занятых Маскоўскай дзяржавай у канцы XV – пачатку XVI ст. Пры гэтым сам Васіль у 1547 г. выехаў у Маскву, а яго маёнтак Кусціна Навагародскага павета «*по зрадцы нашомъ Василью Никифоровичу*» Жыгімонт I перадаў лоўчаму Васілю Мацкавічу[78]. Такім чынам, пасля гэтага ён таксама страціў усялякую сувязь з Давыд-Гарадоцкім княствам.

Яшчэ адзін давыд-гарадоцкі акт (дакумент 6) звязаны з іншай шляхецкай ваколіцай – Альпень. Гэта прывілей пінскага князя Фёдара Іванавіча Яраславіча і яго жонкі Алены ад 1503 г. Савасцьяну Скеве-Апановічу і Грыцку Князіковічу на 5 дварышчаў. Дадзены дакумент – безумоўны фальсіфікат. Яго графіка неўласціва першай чвэрці XVI ст., а тэкст утрымлівае шматлікія анахранізмы[79]. Скевы-Апановічы не фігуруюць у шэрагах давыд-гарадоцкай шляхты ні ў попісе войска ВКЛ 1528 г., ні ў пераліку прывілеяў пінскай і давыд-гарадоцкай шляхце ад 1554 г.[80]

Постаць Савасцьяна Скевы-Апановіча з'яўляецца ключавой для разумення абставін узнікнення фальсіфіката. Апановічы (Скевы-Апановічы, Скевы з Пазняк Апановічы, Гапановічы) фіксуюцца ў Давыд-Гарадоцкім княстве з сярэдзіны XVII ст. і паводле стану на канец стагоддзя валодалі 5 дымамі з падданымі[81]. Магчыма, Апановічы жылі ў Альпені і раней, але яны дакладна не фіксуюцца ў шэрагах давыд-гарадоцкай шляхты 70-х гг. XVI ст.[82] У канцы XVII – першай трэці XVIII ст. Апановічы адзначаны ў шматлікіх судовых працэсах у Давыд-Гарадоцкім гродскім судзе. Так, Базыль Апановіч, яго брат Даніэль і сын Антоні ў 1688 г. атрымалі дэкрэт маршалка ВКЛ Станіслава Казіміра Радзівіла па справе супраць іншых жыхароў ваколіцы Альпень (Альпінскіх, Шаламіцкіх, Славутаў, Канапліцкіх) аб валоданні азёрамі Крыніца, Малое і Вялікае Глушынскае. Сярод іншых дакументаў Апановічы выстаўлялі ў якасці доказу прывілей князя Фёдара Яраславіча, якім якраз і замацоўваліся правы Апановічаў на названыя азёры[83].

Судзіцца з суседзямі працягвалі і сыны Базыля Леан і Антоні-Караль Скева-Апановічы[84]. Апошні з 1732 г. займаў пасаду давыд-гарадоцкага гродскага пісара (часам называў сябе таксама ліўскім чашнікам), у 1736–1737 гг. з'яўляўся адміністратарам маёнтка Давыд-Гарадок крайчага ВКЛ Марціна Мікалая Радзівіла[85]. Пры гэтым Антоні быў спрактыкаваным у юрыдычных справах чалавекам – у маладосці ён служыў пры Галоўным Трыбунале ВКЛ[86], затым стаў пісарам Давыд-Гарадоцкага суда. У дачыненні да яго выстаўляліся абвінавачванні ў фальсіфікацыі тастаментаў – жыхар ваколіцы Рамель Самуэль Міхалавіч Рамульт сцвяр-

---

[76] *Рыбчонак, С.* Курачыцкія гербу «Самсон» // Малы гербоўнік Наваградзкай шляхты. – Мінск: БелНДІДАС, 1997. – С. 67. З паказаных у 1694 г. толькі прадстаўнікі роду Дутых належалі да старога, яшчэ часоў князёў Яраславічаў, давыд-гарадоцкага баярства (НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 3. – Спр. 12010. – Арк. 243; Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом княжестве Литовском, с присовокуплением грамот и привилегий на входы в пущи и на земли, составленная старостою мстибоговским Григорием Богдановичем Воловичем в 1559 году. – Вильна: Типография Губернского правления, 1867. – С. 336–337).

[77] Як сведчаць тыя ж дакументы, іншыя галіны гэтага роду – Першкавічы і Андрэевічы – згаслі ў мужчынскай лініі ў першай трэці XVI ст.

[78] НГАБ. – КМФ 18. – Воп. 1. – Спр. 31. Арк. 80–80 адв.; Boniecki, A. Poczet rodów… – S. 212.

[79] Пра гэта падрабязней гл. заўвагі да дакумента 6.

[80] Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 523. Кн. Публічных спраў 1 / Падрыхт. А. І. Груша, М. Ф. Спірыдонаў, М. А. Вайтовіч; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск: Беларуская навука, 2003. – С. 152–153; Ревизия пущ… – С. 334–336.

[81] *Sienkiewicz, W.* Szlachta zależna w Wielkim Księstwie Litewskim od połowy XVII do połowy XVIII wieku. Studium z dziejów feudalizmu litewskiego: maszynopis pracy doktorskiej. – Warszawa, 1982. – S. 292; НГАБ. – КМФ 5. – Воп. 1. – Спр. 677. – Арк. 51 адв.; Спр. 678. – Арк. 42 адв.; Спр. 679. – Арк. 45 адв.

[82] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 1133. – Арк. 8–8 адв.

[83] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 14. – Спр. 271. – Арк. 376–379 адв.

[84] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 14. – Спр. 271. – Арк. 4–6 адв., 80–83 адв. 141–141 адв., 208–211 адв., 275–276 адв.

[85] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 14. – Спр. 271. – Арк. 576–576 адв.

[86] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 14. – Спр. 271. – Арк. 628–631 адв.

джаў, што Антоні Апановіч у 1738 і 1740 гг. сфальсіфікаваў тастаменты яго сястры Ганны і брата Юзафа[87]. Такім чынам, прывілей князя Фёдара Яраславіча, хутчэй за ўсё, быў сфальсіфікаваны Базылём ці яго сынам Антоніем Скевамі-Апановічамі з мэтай атрымаць падмацаванне ў спрэчках з суседзямі за землі ў ваколіцы Альпень. Таксама нельга выключаць магчымасці, што гэты фальсіфікат быў патрэбны Скевам-Апановічам для падачы на разгляд камісараў князёў Радзівілаў падчас правядзення зямянскіх рэвізій у якасці абгрунтавання шляхецкага статусу і валодання зямлёй[88]. Так ці інакш, Скевы-Апановічы сваёй мэты дасягнулі. 21 верасня 1732 г. Антоні і яго брат Леан атрымалі пацвярджальны прывілей Марціна Мікалая Радзівіла на ранейшыя прывілеі і землі ў ваколіцы Альпень з умовай выстаўлення каня[89].

Нягледзячы на такое відавочна адрознае паходжанне, дакументы Касцюшковічаў і сфальсіфікаваны прывілей Апановічаў у XIX ст. чакаў падобны лёс. Усе яны апынуліся ў комплексе дакументаў, якія падаваліся шляхтай ваколіц Рамель, Мачуль і Альпень Мазырскага павета Мінскай губерні ў Мінскую цывільную палату ў 1837 г., пасля таго, як іх землі былі прызнаны ўласнасцю давыд-гарадоцкага ардыната Леана Радзівіла[90]. Апановічы на той час ужо не жылі ў Альпені, а іх прывілей выкарыстоўвалі іншыя шляхціцы (пераважна, Зінавовічы-Ляшкевічы-Альпінскія), для вядзення працэсаў супраць якіх ён некалі быў сфальсіфікаваны.

Наступныя тры акты (дакументы 8, 9, 10) тычацца шляхты (баяр), якая валодала землямі адначасова ў Давыд-Гарадоцкім і Клецкім княствах. У адрозненне ад папярэдніх, гэтыя акты трапілі ў нясвіжскі архіў Радзівілаў, а не знаходзіліся на руках у тых, чыім продкам яны некалі былі нададзены. Што тычыцца роду Шчэпаў (дакументы 8, 10), то, напэўна, гэты род згас. Самі ж дакументы павінны былі трапіць да Радзівілаў у 1614 г., калі нашчадкі атрымальніка гэтых прывілеяў Фёдара Шчэпы пазбыліся сваіх клецкіх зямель на карысць маршалка ВКЛ Яна Альбрыхта Радзівіла[91]. У сваю чаргу прадстаўнікі роду Долматаў (дакумент 9) фіксуюцца ў клецкім рэгіёне яшчэ ў пачатку XX ст.[92] Магчыма, страта імі прывілея князя Фёдара Іванавіча Яраславіча на землі і людзей у сяле Вялікія Арлы Давыд-Гарадоцкага княства была абумоўлена тым, што ўжо ў сярэдзіне XVII ст. яны гэтыя землі не трымалі, а аселі ў іншым радзівілаўскім валоданні – Клецкім княстве. Гісторыя Шчэпаў і Долматаў таксама ўяўляе сабой цікавы прыклад узаемаадносін дробнамаёмаснай шляхты з князямі Радзівіламі. Пасля пераходу Клецкага княства ва ўласнасць Радзівілаў (1558 г.) Шчэпы, застаючыся ў складзе павятовай шляхты Пінскага павета (адкуль яны паходзілі), адначасова апынуліся ў складзе залежных ад Радзівілаў зямян, якія выконвалі службу «*да замку Клецкага*». Сітуацыя змянілася ў 1590 г., калі маршалак ВКЛ Альбрыхт Мікалаевіч Радзівіл перадаў маёнтак Лукавец (пра яго гл. дакументы 8, 10) Мікалаю Іванавічу Шчэпе з умоўнага ў застаўное трыманне за пазыку ў 500 коп літоўскіх грошай. Пры гэтым у застаўным лісце Альбрыхт Радзівіл адзначаў, што гэтым самым ён «*п(а)на Миколаѧ Щепѹ ѿт сего часу и днѧ и даты, нижеи в семъ листе ѿписаное, с тымъ именьем Лукавцемъ з владзы моее, всѧкое службы и прысудѹ так моего дворного, ѧко и замку моего Клецкого вызволѧю, и ѿт всих повинностеи и податков с того именѧ Лукавца волнымъ чыню аж до жывота его, […] со всимъ тымъ именемъ пана Миколаѧ Щепу в повет и прысуд его королевъское м(и)л(о)сти воеводства Новгородского выпущамъ*»[93]. Такім чынам, Шчэпы на пэўны час увайшлі ў склад паўнапраўнай шляхты не толькі Пінскага павета, але і Навагародскага ваяводства.

Дачыненні Долматаў з Радзівіламі былі больш складанымі. Яны працягвалі валодаць выслужаным у князя Фёдара Яраславіча маёнткам Цапра Клецкага княства. Пры гэтым, прынамсі, у XVIII ст. яны знаходзіліся на радзівілаўскай службе. З 1756 г. Станіслаў Антоніевіч Долмат з'яўляўся палкоўнікам Клецкай і Давыд-Гарадоцкай ардынацыі, яго сын Міхал быў харужым надворнай міліцыі віленскага ваяводы Караля Станіслава Радзівіла. Нягледзячы на службу Радзівілам, у 1762 г. той самы Станіслаў Долмат пачаў працэс Юзафа Борзабагатага і клецкага ардыната Юзафа Мікалая Радзівіла аб валоданні маёнткам Цапра. Сярод

[87] НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 2694. – Арк. 7 адв.–8.

[88] Але на самім прывілеі ад 1503 г. няма (у адрозненне ад дакументаў 12, 16, 18) пазнак аб паданні на разгляд радзівілаўскіх камісараў у 1694 г. Таксама Апановічы выразна адасабляюцца ад большасці жыхароў Альпені. Пра шматлікія працэсы супраць альпенскай зямянскай супольнасці гаворка ішла вышэй, таксама яны вылучаліся веравызнаннем – калі большасць мясцовай шляхты заставалася праваслаўнай, Апановічы, верагодна, былі каталікамі ці ўніятамі. Так, у 1731 г. жыхары Альпені зрабілі супольны запіс на мясцовую праваслаўную царкву, але Апановічаў сярод фундатараў не аказалася (НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 14. – Спр. 271. – Арк. 319–320 адв.). Верагодна, Апановічы не ўдзельнічалі ў руху давыд-гарадоцкай шляхты за выхад з-пад радзівілаўскай юрысдыкцыі. Пра гэта ўскосна сведчыць і тое, што ў 1732 г., у самы разгар гэтага руху, Антоні Скева-Апановіч быў прызначаны Радзівіламі пісарам Давыд-Гарадоцкага гродскага суда. Паказальна, што ў той жа час давыд-гарадоцкім гродскім суддзёй быў не прадстаўнік мясцовай супольнасці, а выхадзец з пінскай павятовай шляхты – Язафат Рыгор Радцэвіч-Платніцкі.

[89] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 14. – Спр. 271. – Арк. 373–375 адв.

[90] НГАБ. – Ф. 147. – Воп. 3. – Спр. 12010. – Арк. 96–140 адв., 191–282.

[91] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 1852. – Арк. 19–24.

[92] НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 928.

[93] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 1852. – Арк. 9–17.

іншага, Станіслаў Долмат абвінавацію Радзівіла ў забранні родавых дакументаў. Гэтая справа, аднак, не тычылася дакумента 9. Ён трапіў у архіў Радзівілаў раней і першапачаткова захоўваўся ў іх маёнтку Чарнаўчыцы Берасцейскага ваяводства, адкуль у 1760 г. быў узяты прадстаўніком Юзафа-Мікалая Радзівіла Ануфрыем Рыхліцкім для вядзення судовых працэсаў супраць давыд-гарадоцкай шляхты (!)[94].

Прывілей вялікай княгіні літоўскай Боны Сфорцы ад 1551 г. Васілю Юнкавічу і Федку Родцавічу (дакумент 22) да 30-х гг. XIX ст., калі падчас «разбору шляхты» быў пададзены ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход, захоўваўся ў нашчадкаў яго атрымальнікаў – пінскіх дробнашляхецкіх родаў Юнкевічаў-Платніцкіх і Радцэвічаў-Платніцкіх. Верагодна, асноўнымі яго захавальнікамі з'яўляліся якраз Радцэвічы-Платніцкія, якія ў XVII–XVIII стст. працягвалі валодаць нададзеным паводле гэтага прывілея дварышчам Ляхавіцкае ў сяле Плотніца Пінскага павета[95]. Род Радцэвічаў складаўся з дзвюх галін. У канцы XVII – пачатку XVIII ст. прадстаўнікі першай з іх называліся Радцэвічамі-Ляховічамі-Платніцкімі, а другой – проста Радцэвічамі-Платніцкімі[96]. Паміж гэтымі дзвюма галінамі ў 1696–1718 гг. вяліся працяглыя судовыя працэсы, адным з аспектаў якіх была справа трымання агульных родавых прывілеяў. Менавіта падчас гэтых разбіральніцтваў дакумент 22 быў унесены ў 1701 г. у актавыя кнігі Пінскага земскага суда[97].

## Комплекс лацінскіх дакументаў
(дакументы 11, 15, 19)

Комплекс лацінскіх дакументаў складаецца з трох фундушавых лістоў, выдадзеных на касцёлы ў Мерачы і Адэльску, а таксама ў Шылавічах Ваўкавыскага павета. На дадзены момант два з гэтых фундушоў (мерацкі і адэльскі) знаходзяцца ў фондзе «Радзівілы, князі», а адзін (шылавіцкі) – у фондзе Слонімскага земскага суда. Аднак у гэтыя фонды яны былі ўкладзены непасрэдна падчас захоўвання ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску і не маюць да іх непасрэднага дачынення. Напрыклад, фундушавы ліст Шылавіцкаму касцёлу трапіў у фонды Слонімскага земскага суда толькі ў 1981 г. «з россыпу». Падобным быў шлях мерацкага і адэльскага фундушоў у фонд «Радзівілы, князі».

Дакументы 11 і 19 апісваюць невялікія наданні, зробленыя на карысць Мерацкага і Шылавіцкага касцёлаў адпаведна вялікім князем літоўскім Жыгімонтам І і прадстаўніцамі роду Давойнаў-Крупскіх. Па ўсёй верагоднасці, менавіта Крупскія былі фундатарамі касцёла ў Шылавічах Ваўкавыскага павета[98]. Дакумент 19 (фундуш Ганны, народжанай Крупскай, Радагоскай ад 1544 г.) уключае ў сябе і больш ранняе наданне (ад 1511 г.), здзейсненае ад імя трох сясцёр Крупскіх. Апрача касцельных валоданняў, ліст адлюстроўвае сямейную гісторыю Крупскіх і наяўны ў іх перад згасаннем роду[99] комплекс маёнткаў. З іншых крыніц вядома, што цэнтрам валоданняў Давойнаў-Крупскіх былі Крупы (Крупа) Лідскага павета (ад якога ўтварылася родавае прозвішча), але яны распараджаліся немалымі маёнткамі і ў іншых рэгіёнах ВКЛ. Перш за ўсё, маюцца на ўвазе Шылавічы Ваўкавыскага павета і Ястрабель (Ястрамбель) Навагародскага (?) ваяводства[100], пра якія таксама згадваецца ў дакуменце 19. У сваю чаргу, надзвычай каштоўнымі з'яўляюцца звесткі з дакумента 19 пра валоданне сёстрамі Крупскімі домам у Вільні, які таксама быў запісаны на Шылавіцкі касцёл.

Фундуш на Шылавіцкі касцёл адлюстроўвае таксама і лакальныя сувязі ўнутры шляхецкай супольнасці ВКЛ. Ліст быў выдадзены ў 1544 г. у Вільні, дзе, магчыма, на той момант пражывала Ганна, народжаная Крупская, Радагоская. Але сярод сведкаў дакумента згадваюцца Станіслаў Касінскі і Мікалай Краснадубскі. І Касінскія, і Краснадубскія (Краснадэмбскія) з'яўляліся выхадцамі з памежнага з Ваўкавыскім паветам Падляшша[101]. Верагодна, іх прысутнасць у спісе тастатараў не была выпадковай. Яны складалі част-

---

[94] НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 913. – Арк. 2.

[95] НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 2497. – Арк. 46–46 адв., 129–130 адв. У сваю чаргу, асноўным надзелам Юнкевічаў-Платніцкіх у Плотніцы ў XVII–XVIII стст. мелася быць дварышча Бруякаўскае (НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 31. – Арк. 59–60 адв.), назва якога ўтварылася ад імя колішняга ўладальніка – значнага пінскага баярына сярэдзіны XVI ст. Ждана Бруякі, які ў 1547–1551 гг. быў падстаростам давыд-гарадоцкім (*Грушевский, А. С.* Пинское Полесье, XIV–XVI вв. – Киев: Типография Н. Т. Корчак-Новицкого, 1903. – С. 96).

[96] НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 2497. – Арк. 34 адв.

[97] НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 2497. – Арк. 3–3 адв., 79–82 адв., 102–107 адв., 196–196 адв.

[98] Acta primae Visitationis diocesis Vilnensis anno Domini 1522 peractae / Sud. S. C. Rowell. – Vilnius: LII Leidykla, 2015. – P. 250–251.

[99] Апошнім мужчынскім прадстаўніком роду быў якраз брат Ганны, Соф'і і Ітамілы Фелікс (Шчасны) Пятровіч Крупскі, які памёр у 1506 г. (*Boniecki, A.* Poczet rodów… – S. 159; *Boniecki, A.* Herbarz polski. – T. 12. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1908. – S. 350).

[100] Пра лакалізацыю гэтага валодання Крупскіх падрабязней гл. заўвагі да дакумента 19.

[101] *Boniecki, A.* Herbarz polski. – T. 11. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1907. – S. 272–276; *Boniecki, A.* Herbarz polski. – T. 12. – S. 219–223; *Uruski, S.* Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. – T. 7. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1910. – S. 273–277; *Uruski, S.* Rodzina. – T. 8. – S. 34–35; 172–174; Urzędnicy podlascy XIV–XVIII wieku. Spisy. – Kórnik: Biblioteka Kórnicka, 1994. – S. 172–174.

ку тэрытарыяльна блізкай да Ваўкавыскага павета падляшскай шляхецкай супольнасці, а стасункі паміж падляшскімі і ваўкавыскімі выхадцамі, відавочна, падтрымліваліся таксама і ў сталіцы Вялікага Княства Літоўскага.

Значна большае наданне адлюстравана ў фундушы на Адэльскі касцёл (дакумент 15). У гэтым дакуменце занатаваны звесткі аб трох розначасавых лістах на карысць касцёла ў Адэльску – прывілеі Казіміра, выдадзеным напрыканцы яго панавання (каля 1490–1492 гг.), прывілеі Аляксандра ад 1494 г., пацвярджальным прывілеі Жыгімонта І ад 1515 г. (апошні канфірмаваны віленскім біскупам Янам з князёў Літоўскіх у 1525 г. – гэтым пацвярджэннем і з'яўляецца дакумент 15).

Зразумела, што ўсе тры дакументы з'яўляюцца важнай крыніцай па гісторыі рымска-каталіцкага духавенства ў Вялікім Княстве Літоўскім. У іх згадваюцца парафіяльныя святары – мерацкі Марцін з Мніна, адэльскі Павел з Цехановіц, шылавіцкі Крысцін. Калі два першыя добра вядомы па іншых крыніцах[102], то ліст Шылавіцкаму касцёлу – гэта рэдкая згадка пра мясцовага плябана пачатку XVI ст. Крысціна. Сярод сведкаў у адэльскім фундушы таксама фігуруе Ян Даманоўскі, які ў будучым зрабіў бліскучую касцельную і дзяржаўную кар'еру – стаў жамойцкім біскупам і адным з укладальнікаў Статута ВКЛ 1566 г.

Астатнія змешчаныя ў дадзеным выданні дакументы ўяўляюць сабой асобныя акты, якія, аднак, таксама пэўным чынам звязаны з нясвіжскім архівам князёў Радзівілаў або з землямі, якімі яны валодалі.

Дакумент 17 уяўляе сабой прывілей вялікага князя літоўскага Жыгімонта І ад 1542 г. лідскаму баярыну Фёдару Мажэйку на дварэц Дзераўное. У другой палове XVII – пачатку XIX ст. гэты дакумент знаходзіўся ў распараджэнні зямянскага роду Мажэйкаў, прадстаўнікі якога падавалі яго ў Мінскі дваранскі дэпутацкі сход для доказу дваранскага паходжання ў 1815 г.[103] Мажэйкі ўжо ў сярэдзіне XVII ст. фіксуюцца ў складзе зямян (залежнай шляхты) у вёсцы Кандратавічы ў маёнтку Старыца Капыльскага княства[104]. Паходжанне старыцкіх зямян Мажэйкаў і іх сувязь з атрымальнікам прывілея Фёдарам невядома. У Лідскім павеце ў першай палове XVI ст. Мажэйкі (Мажэйкавічы) не фіксуюцца[105], дварэц Дзераўное таксама не лакалізуецца. Прывілей дакладна існаваў у 1675 г., калі ўносіўся ў навагародскія гродскія кнігі, і ў 1678 г., калі падаваўся на рэвізію губернатара Слуцкага і Капыльскага княства Казіміра Крыштафа Клакоцкага. Магчыма, ён быў створаны для падмацавання шляхецкага паходжання старыцкіх зямян Мажэйкаў[106].

Дакумент 7 (прадажны ліст Адама Янушкавіча князю Мацвею Мікіцінічу на невялікія зямельныя надзелы каля Вільні – дварэц Эйтвілішкі і іншыя) захаваўся не цалкам – яго правы край быў адарваны, у тым ліку страчана частка з датай выдання, таму акт шырока датуецца 1503–1506 гг.[107] Тым не менш, гэта вельмі цікавы дакумент як сваёй архіўнай гісторыяй, так і зместам. Ужо нясвіжскія архівісты не маглі растлумачыць, як дакумент трапіў у нясвіжскія зборы і да якога маёнтка належыць[108]. Тым часам з кніг Метрыкі ВКЛ вядома, што 11 ліпеня 1522 г. Мацвей Мікіцініч прайграў у гаспадарскім судзе працэс аб дварцы Эйтвілішкі супраць гарадзенскага старосты Юрыя Мікалаевіча Радзівіла[109]. Верагодна, менавіта ў выніку гэтага працэсу Мацвей Мікіцініч мусіў перадаць прадажны ліст на Эйтвілішкі ў рукі Радзівілаў.

У сваю чаргу змест дакумента 7, па ўсёй верагоднасці, дазваляе прасачыць лёсы дробнага баярства, звязанага з родам віленскага ваяводы Яна Доўгірда (†каля 1443). У прадажным лісце адзначаецца, што брата яго выстаўцы Адама Янушкавіча звалі Кандрат. У дакументах ад 1454 і 1461 гг., якія выдаў сын віленскага ваяводы Доўгірда Андрушка, у якасці сведкі фігураваў Кандрат Янушкавіч[110]. Адным з маёнткаў Андрушкі Доўгірдавіча меўся быць двор Струна Віленскага павета, які ў 1502 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр надаў

---

[102] *Kurczewski, J.* Kościół zamkowy, czyli Katedra wileńska. – Cz. 3: Streszczenie aktów kapituły wileńskiej. – Wilno: Drukiem Józefa Zawadzkiego, 1913. – S. 34. 36, 540; *Ochmański, J.* Biskupstwo wileńskie w średniowieczu: ustrój i uposażenie. – Poznań: UAM, 1972. – S. 45; *Ališauskas, V.; Jaszczołt, T.; Jovaiša, L.; Paknys, M.* Lietuvos katalikų dvasininkai XIV–XVI a. – Vilnius: Aidai, 2009. – P. 229, 322–323; Acta primae Visitationis... – P. 189, 222.

[103] НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 1. – Спр. 62. – Арк. 46 адв.

[104] НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 2159. – Арк. 69–70 адв.; Ф. 160. – Воп. 1. – Спр. 23. – Арк. 331–331 адв.

[105] Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года… – С. 62.

[106] Слуцкія і капыльскія зямяне валодалі даволі значным комплексам фальшывых дакументаў. Напрыклад, у размешчаным непадалёк ад Старыцы маёнтку Грозава пражывалі зямяне (былыя панцырныя баяры) Жоўрыды, якія ў 1669 г. падчас вядзення справы аб «нагане шляхецтва» ў якасці доказу высакароднага паходжання падавалі сфальсіфікаваны або інтэрпаляваны прывілей князя Юрыя Сямёнавіча Алелькавіча-Слуцкага ад 1530 г. (НГАБ. – Ф. 319. – Воп. 2. – Спр. 1049. – Арк. 38–39, 47 адв.).

[107] Пра гэта падрабязней гл. заўвагі да дакумента 7.

[108] Хоць і правільна аднасілі яго да дакументаў згаслай біржанскай лініі Радзівілаў.

[109] Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 10. Užrašymų knyga 10 (1440–1523) / Parengė E. Banionis ir A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1997. – P. 113; *Wolff, J.* Kniaziowie litewsko-ruscy… – S. 117.

[110] Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezji wileńskiej. – T. 1. – Z. 1 / Wyd. J. Fijałek, W. Semkowicz. – Warszawa: PAU, 1932. – S. 245, 270–273; *Budzisz, W.* Spadkobiercy wojewody wileńskiego Dowgirda // Rocznik Lituanistyczny. – T. 2. – Warszawa: IH PAN, 2016. – S. 25–29.

як раз Мацвею Мікіцінічу[111]. Магчыма, пасля атрымання Струны Мацвей Мікіцініч пачаў скупаць землі ў баяр, якія былі звязаны з папярэднімі ўладальнікамі гэтага маёнтка.

Такім чынам большасць дакументаў, змешчаных у выданні, публікуецца ўпершыню. Яны істотна дапаўняюць нашы веды пра розныя бакі сацыяльна-эканамічнага жыцця ВКЛ у канцы XIV – першай палове XVI ст. Пры гэтым яны падаюць інфармацыю не толькі пра буйныя маёнткавыя комплексы, звесткі пра якія традыцыйна лепш адлюстраваны ў крыніцах, але і пра дробнашляхецкія валоданні. Дадзеныя дакументы ў пераважнай большасці ўтвараюць некалькі ўнутрана звязаных комплексаў, якія дазваляюць прасачыць абставіны існавання канкрэтных маёнткаў і жыццядзейнасці іх уладальнікаў на працягу некалькіх пакаленняў.

## Прынцыпы публікацыі дакументаў

Пры падрыхтоўцы ***кірылічных дакументаў*** складальнікі ў асноўным кіраваліся метадычнымі рэкамендацыямі А. І. Грушы[112].

